№№63–64
(2583–2584)

20 красавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!

Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**

Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.

Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ВІЗІТЫ

Беларусы ў Страсбургу

Дэлегацыя беларускай апазіцыі знаходзіцца ў Страсбургу, дзе Парламенцкая асамблея Савета Еўропы праводзіць чарговую сесію.

Дэлегацыя Аб'яднаных дэмакратычных сіл выехала з намерам прэзентаваць у ПАСЕ "Малую Канстытуцыю", стратэгію і тактыку дзеянняў АДС, а таксама падняць праблему з арыштам дэпутата Вярхоўнага Савета 13-га склікання Андрэя Клімава і беларускіх палітзняволеных увогуле.

У межах сесіі адбываюцца спецыяльныя слуханні па сітуацыі з захаваннем правоў чалавека і дэмакратыяй у рэгіёне, у якіх бяруць удзел вярхоўны камісар ААН па правах чалавека **Луіз АРБУР,** старшыня Еўрапейскага суда па правах чалавека **Жан-Поль КАСТА**, генеральны сакратар "Міжнароднай амністыі" **Ірэне КХАН**, выканаўчы дырэктар "Х'юман райтс уотч" **Кенет РОТ**.

Пазіцыю Аб'яднаных дэмакратычных сіл у Еўропе прадстаўляюць старшыня Палітсавета АДС **Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ,** лідэр АГП **Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА**, старшыня БСДГ **Станіслаў ШУШКЕВІЧ**, выканаўца абавязкаў старшыні БСДП (Грамада) **Анатоль ЛЯЎКОВІЧ**, сакратар Партыі камуністаў Беларускай **Валерый УХНАЛЁЎ**, а таксама прадстаўнікі няўрадавых арганізацый: Гары Паганяйла, Юрый Варонежцаў, Уладзімір Колас, Антаніна Кавалёва... Жонка былога кандыдата ў прэзідэнты Ірына Казуліна, якая таксама атрымала запрашэнне на сесію ПАСЕ, у Страсбург не паехала — Ірына Іванаўна зараз знаходзіцца ў ЗША.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

ДАСЛОЎНА

"Еўрапейская супольнасць застанецца няпоўнай да таго часу, пакуль Беларусь знаходзіцца па-за нашым агульным еўрапейскім домам", — заявіў 16 красавіка старшыня Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) **Рэне ван дэр ЛІНДЭН**, адкрываючы веснавую сесію арганізацыі. Стэнаграма яго выступлення размешчана на афіцыйным сайце ПАСЕ.

"Я шчыра спадзяваўся, што канструктыўны падыход ПАСЕ і мой нядаўні візіт у Мінск выклічуць станоўчую рэакцыю беларускіх уладаў", — зазначыў Рэне ван дэр Ліндэн. Пры гэтам ён падкрэсліў, што ПАСЕ не можа ігнараваць арышты і затрыманні шматлікіх апазіцыйных актывістаў напярэдадні і падчас правядзення дэманстрацыі 25 сакавіка.

"Аднак я ўсё яшчэ спадзяюся, што неўзабаве мы зможам вітаць сярод нас Беларусь, якая звяжа сябе абавязацельствам дэмакратычных рэформаў", — сказаў Рэне ван дэр Ліндэн.

Таццяна КАРАВЯНКОВА, БелаПАН.

Слуханні ў парламенце Нарвегіі

Дамоўленасць правесці ў парламенце Нарвегіі слуханні па сітуацыі на Беларусі дасягнутая 16 красавіка лідэрамі Аб'яднаных дэмакратычных сіл з нарвежскімі дэпутатамі. Слуханні маюць прайсці гэтай восенню, паведаміў старшыня Нацыянальнага камітэта АДС Анатоль Лябедзька з Осла.

Свабоду маладафронтаўцам!

16 красавіка каля 15 гадзін дня на праспекце Францыска Скарыны з'явілася 15-метровая расцяжка "Свабоду маладафронтаўцам!". Акцыя была прымеркавана да Дня Салідарнасці, які адзначаецца дэмакратычнымі сіламі штомесяц 16-га чысла. Расцяжка правісела на будынку побач са станцыяй метро "Усход" каля дзвюх гадзін.

Радаўніца... Дзень памяці продкаў

У мінулы аўторак на ўсіх могілках было не размінуцца. У кожнага з нас нехта ўжо пахаваны, і як тут не ўспомніць, не пасядзець у крыжа, не падумаць...

photo.bymedia.net

ПРАПАНОВА

Аляксандра Лукашэнку запрасілі на «Чарнобыльскі Шлях»

Аргкамітэт "Чарнобыльскага Шляху" звярнуўся з пісьмом да Аляксандра Лукашэнкі, у якім запрасіў кіраўніка дзяржавы прыняць удзел у жалобным мерапрыемстве. А таксама даць справаздачу аб тым, як былі рэалізаваны шматлікія праграмы дапамогі з-за мяжы, а таксама колькі і як было патрачана сродкаў з нацыянальнага бюджэту на ліквідацыю наступстваў катастрофы.

"Шаноўны Аляксандр Рыгоравіч, — гаворыцца ў лісце. — 26 красавіка 2007 года спаўняюцца 21-я ўгодкі з трагічнага дня ў гісторыі сучаснай Беларусі. Даты, якая стала лёсавызначальнай у жыцці тысяч беларусаў. У 1986 годзе ў гэты дзень на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі адбылася найбуйнейшая ў гісторыі тэхнагенная катастрофа, нанесла непапраўныя страты нашай краіне. Прыкладна 2/3 радыеактыўных выкідаў аселі на нашай зямлі, забрудзіўшы прыкладна пятую частку тэрыторыі з 20% насельніцтва. Амаль усю Беларусь накрыла першая хваля кароткажыццёвых радыенуклідаў, частку якіх асаджалі на нашай тэрыторыі прымусова, каб не пайшлі на Маскву. Усё рабілася пад прыкрыццём злачыннай сакрэтнасці, і людзі не маглі абараніцца ад гэтага ўдару.

Пачынаючы з 1989 года дэмакратычныя сілы Беларусі ўшаноўваюць дату катастрофы на ЧАЭС. Кожны год падчас мітынгаў і шэсцяў дэмакратычныя сілы выказвалі патрабаванні да ўлады. Гэта былі патрабаванні расказаць праўду пра катастрофу і яе наступствы, патрабаванні вярнуць льготы ліквідатарам катастрофы і перасяленцам з зоны забруджання радыенуклідамі.

На пачатку 1990-х гадоў Злучаныя Штаты Амерыкі і Еўрапейскі Саюз выдаткоўвалі вялікія сродкі на розныя гуманітарныя праграмы дзеля пераадолення наступстваў катастрофы. Аднак ані перасялення людзей з забруджаных тэрыторый, ані крокаў па абароне іх здароўя зроблена не было. Наадварот: улады адмянілі льготы чарнобыльцам і заявілі, што няма ніякай небяспекі для жыцця на забруджаных тэрыторыях.

Мы патрабуем Вас як кіраўніка дзяржавы даць справаздачу аб тым, як былі рэалізаваны шматлікія праграмы дапамогі з-за мяжы, а таксама аб тым, колькі і як было патрачана сродкаў з нацыянальнага бюджэту на ліквідацыю наступстваў катастрофы?

Мы ўпэўнены, што такая справаздача толькі падкрэсліць у вачах міжнароднай супольнасці ўяўленне аб Беларусі, гатовай на рэальныя крокі дэмакратызацыі, выказаных у тым ліку ў звароце Еўракамісіі ад 17 лістапада 2006 года.

Ад імя арганізатараў "Чарнобыльскага Шляху" запрашаем Вас прыняць удзел у жалобным мерапрыемстве.

Іван НІКІТЧАНКА,
старшыня аргкамітэта
"Чарнобыльскага Шляху",
сябра Партыі БНФ, прафесар."

Нагадаем, арганізатары "Чарнобыльскага шляху" плануюць пачаць акцыю 26 красавіка ў 18.00 з плошчы Якуба Коласа і рухацца па тратуарах да будынка Нацыянальнай бібліятэкі, дзе ў 20.00 плануецца правесці жалобны мітынг.

Вінцук ВЯЧОРКА: «Аргкамітэт "Чарнобыльскага Шляху" распачаў акцыю, якая скіравана на дапамогу дзецям, пацярпелым ад чарнобыльскай катастрофы»

На нядаўняй прэс-канферэнцыі для кіраўнікоў беларускіх сродкаў масавай інфармацыі Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ніколі не адмаўляўся ад чыёй бы то ні было дапамогі ў ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. У той жа час кіраўнік дзяржавы папракнуў прадстаўнікоў апазіцыі, што яны, *"акрамя таго, як таптаць асфальт Чарнобыльскім Шляхам"*, па сутнасці нічога не могуць. Лукашэнка прапанаваў апазіцыянерам адправіцца ў забруджаныя радыяцыяй раёны, каб не словамі, а справамі паказаць, што іх таксама хвалюе чарнобыльская праблематыка.

Не чакаючы парадаў ад Аляксандра Рыгоравіча, аргкамітэт "Чарнобыльскага Шляху" распачаў акцыю, якая скіравана на дапамогу дзецям, пацярпелым ад чарнобыльскай катастрофы. Усе жадаючыя могуць ахвяраваць кніжкі, цацкі, вопратку, аўдыё- і відэапрадукцыю, а таксама грошы для дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі. Рэчы і грашовыя ахвяраванні можна пакінуць у сядзібе БНФ — у Мінску на вул. Машэрава, 8. Сабраныя рэчы і грашовыя сродкі знойдуць сваіх адрасатаў у бараўлянскім Цэнтры дзіцячай анкалогіі. Частка ахвяраванняў трапіць да хворых дзетак, якія жывуць у Брагіне.

Адзін з членаў аргкамітэта "Чарнобыльскага Шляху" старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка больш падрабязна расказаў пра дабрачынную акцыю карэспандэнту "Народнай волі":

— Такія акцыі ладзяцца Беларускім народным фронтам рэгулярна — ажно з канца 80-х гадоў. Іх фармат разнастайны. Сёлета — гэта збор цацак, вопраткі, якія абавязкова будуць перададзены дзеткам у Бараўляны і тым, хто жыве на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях. І гэта не Лукашэнка нам падказаў, што і як мы павінны рабіць. Гэта выключна наша ініцыятыва. Мне падаецца, што на прэс-канферэнцыі Лукашэнка на яе проста адрэагаваў. У палітычным плане для нашага кіраўніка дзяржавы чарнобыльская праблема нявыгадна — на ёй не зробіш палітычнай рэкламы, такой, як на будаўніцтве лядовых палацаў. Ліквідацыя наступстваў чарнобыльскай катастрофы патрабуе шматлікіх выдаткаў. А пасля таго, як дзяржава манапалізавала атрыманне гуманітарнай дапамогі, то выглядае натуральным, што яе аб'ём зменшыўся. Бо адпраўшчыкі гуманітарнай дапамогі рэзонна хочуць бачыць вынік. А яго няма. Больш за тое, пасля прыходу Аляксандра Рыгоравіча да ўлады фактычна спынілася перасяленне людзей з забруджаных тэрыторый, беларускі лідэр неаднойчы казаў, што на забруджаных землях можна вырошчваць агародніну, гадаваць дзяцей...

Мы разумеем, што наша дабрачынная акцыя сітуацыю ў корані не зменіць. Але робім усё, што ў нашых сілах. Мэта акцыі — падтрымаць дзетак, якія сталі заложнікамі наступстваў страшнай аварыі. Па словах Вінцука Вячоркі, акцыя будзе працягвацца да 26 красавіка.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Насця ПАЛАЖАНКА: «Пасадзяць нас — прыйдуць іншыя...»

Правакацыі сталі неад'емнай часткай жыцця 16-гадовай дзяўчыны.

Названы суддзя, які будзе разглядаць крымінальную справу пяцярых "маладафронтаўцаў", — гэта суддзя Савецкага раёна Мінска **Аляксей ТАМАНАЎ**. Прозвішча суддзі паведаміла наймаладзейшая з абвінавачаных — 16-гадовая школьніца **Насця ПАЛАЖАНКА.**

Крымінальная справа ўзбуджана КДБ па Мінску і Мінскай вобласці 4 лютага 2007 года па абвінавачанні ў *"дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі" "Малады Фронт"*. Па справе ў якасці абвінавачаных праходзяць пяцёра маладых людзей ва ўзросце 16—22 гадоў: **Дзмітрый ФЕДАРУК, Алег КОРБАН, Аляксей ЯНУШЭЎСКІ, Барыс ГАРЭЦКІ, Насця ПАЛАЖАНКА.**

Калі нумар газеты здаваўся ў друк, дата судовага пасяджэння яшчэ не была аб'яўлена.

Між тым жыццё працягваецца. Аднак нейкія сілы спрабуюць ачарніць маладых людзей яшчэ да суда, зрабіўшы з іх *"адмарозкаў"*. Як інакш можна трактаваць той факт, што тэлефоны 16-гадовай дзяўчыны, хутчэй яшчэ дзяўчынкі, Насці Палажанка з'явіліся на сайтах сумнеўнага зместу, пра сэнс якіх і няварта расказваць? З падобнага кшталту правакацыямі дзяўчыне даводзіцца сустракацца штодня.

Якім чынам дзяўчына апынулася ў цэнтры крымінальнай гісторыі, чаго чакае ад жыцця? Пра гэта ды пра юнацкія мары "Народнай волі" расказвае сама Насця.

— Насця, якім чынам Вы, прыгожая 16-гадовая дзяўчына, аказаліся ў цэнтры гэтай крымінальнай драмы?

— У 2004 годзе я ўступіла ў шэрагі незарэгістраванага "Маладога Фронту". Тады якраз святкавалася гадавіна бітвы пад Оршай, мяне пазнаёмілі з хлопцамі з "Маладога Фронту", якія і расказалі, што такое "Малады Фронт", чым займаецца, чым жыве. Менавіта тады я зразумела, што мушу быць разам з імі, што, нягледзячы на свой узрост, я магу зрабіць нешта карыснае для людзей.

Сёлета, 4 лютага, 27 чалавек затрымалі ў Мінску на пасяджэнні Цэнтральнай рады. Пяцёра чалавек, супраць якіх узбуджана крымінальная справа, мусіць, бачацца ўладзе самымі актыўнымі, а таму — небяспечнымі.

— Чаму Вы, непаўналетняя дзяўчына, яшчэ школьніца, трапілі ў гэтую "крымінальную" пяцёрку? Відаць, была нейкая акалічнасць, з-за чаго органы звярнулі на Вас такую пільную ўвагу?

— Я думаю, таму, што я ў "Маладым Фронце" амаль тры гады. Гэты час навучыў мяне бачыць, адрозніваць праўду ад хлусні. За гэты час я навучылася змагацца за свае правы і правы тых, хто побач. Я зразумела, што не трэба закрываць вочы і маўчаць, калі табе хлусяць. Гэты час даў мне магчымасць зразумець і адчуць, наколькі я люблю гэтую краіну і на што я здольная дзеля гэтай любові.

Я не збіраюся хаваць свае думкі, мары, мяняць сваю пазіцыю. Я, як і мае "калегі" па крымінальнай справе, дзейнічаю адкрыта, у межах закона, што і не падабаецца ўладзе, хвалюе яе. Бо мы ідзём у людзі з праўдай, згодна з сумленнем, людзі бачаць гэта і давяраюць нам.

Таму такія, як я, перашкаджаюць уладзе весці нейкую сваю брудную палітыку.

Мы — маладзёжная арганізацыя, мы не гуляем у палітычныя гульні за рознымі сталамі. Мы проста займаемся адукацыяй маладых людзей, прапаведуем хрысціянскія каштоўнасці і нацыянальны патрыятызм.

— Што ўяўляе сабой крымінальная справа?

— Крымінальная справа — гэта дзесяткі правакацый, гэта тыдзень допытаў штодня, гэта — ператрусы. Мы сутыкнуліся з процьмай правакацый, прычым у гэтым сэнсе больш за ўсё чамусьці не шанцуе мне. Я вучуся ў сярэдняй школе №73 Мінска з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы, але мяне ўсяляк стараюцца выжыць з урокаў. Нават вось так: не спадабаўся настаўніку знешні выгляд майго сшытка — тут жа на маіх вачах сшытак разрываюць; спазнілася на ўрок літаральна на хвіліну — задзяўбуць.

Але больш за ўсё дастаецца нам ад правакацый. З правакацыямі мы сутыкаемся штодня. Мае тэлефоны, да прыкладу, з'явіліся на сайтах, скажам так, непрыстойнага зместу — такое крыўдна любому чалавеку. Мне здаецца, робіцца гэта яшчэ да суда нездарма, каб на судзе выставіць нас як людзей, якія вядуць амаральны лад жыцця, а не людзей, якія прапаведуюць хрысціянскія каштоўнасці. Толькі нам няма чаго баяцца.

Учора *(13 красавіка. —* **Аўт.***)* тату — намесніка дырэктара унітарнага прадпрыемства "Медык" — звольнілі з працы. Я і падумаць не магла, што ўлады змогуць зайсці так далёка і весці сваю справу настолькі брудна — за мае погляды звольніць майго тату, які праявіў сябе з найлепшага боку на працы, самаадданым супрацоўнікам. Гэта вельмі балюча ўдарыла па нашай сям'і. А для мяне гэта было сігналам, што гэтая ўлада не спыніцца ні перад чым, таму ў нас, у маладафронтаўцаў, засталося толькі адно — ісці наперад да канца.

— Пра такое лепш не пытацца, і ўсё ж: чаго Вы чакаеце ад суда?

— Рыхтуюся да самага горшага. Суд — абсалютна непрадказальная рэч. Але мы рыхтуемся рэгістраваць "Малады Фронт", працуем, стараемся не ўзгадваць, што наперадзе — суд.

Вядома, нас могуць пасадзіць — як ужо пасадзілі Артура Фінькевіча, Дзмітрыя Дашкевіча, Паўла Севярынца. Але, нават пасадзіўшы нас, улады не змогуць спыніць маладафронтаўскую дзейнасць. Пакаленне маладых прагне перамен.

Я працую вельмі самааддана. Калі пасадзілі Севярынца — ягоную справу працягвалі Фінькевіч, Дашкевіч; пасля іх — працягваем мы. Так будзе, калі пасадзяць і нас, — прыйдуць іншыя.

Я мару паступіць у беларускую ВНУ і стаць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры (не ведаю, як складзецца лёс). Прыйдзе час, калі нам не трэба будзе займацца палітыкай — ніхто з нас не робіць палітычную кар'еру, мы проста вучымся, жывём асабістым жыццём. Я не хачу з'язджаць за мяжу, я хачу жыць і працаваць тут, у Беларусі. Хачу жыць у дэмакратычнай еўрапейскай краіне...

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

ДАВЕДКА. 2 жніўня 2007 года Насця Палажанка адзначыць сваё 17-годдзе. Нарадзілася ў Мінску, беларуска. Бацька адзін выхоўвае дваіх дзяцей, маці памерла. Нейкі час Насця хадзіла ў музычную школу, спрабавала спяваць у розных гуртах. Цікавіцца беларускай гісторыяй і культурай. Цяпер заканчвае 10-ы клас СШ №73 Мінска з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы.

Большую частку вольнага часу праводзіць разам з сябрамі па незарэгістраванай арганізацыі "Малады Фронт".

ПАЛІТКУХНЯ

Мінюст не пагадзіўся з доказамі Калякіна

Вярхоўны суд адмовіў Саюзу левых партый у іску да Міністэрства юстыцыі Беларусі.

Нагадаем, Мінюст адмовіўся зарэгістраваць Саюз левых партый у сувязі з тым, што яго ўстаноўчая канферэнцыя прайшла не ў Беларусі, а ва Украіне — у Чарнігаве. Маўляў, дзейнасць партый, згодна з заканадаўствам, распаўсюджваецца толькі на Беларусь, а не за яе межы. Прадстаўнікі партый, якія ўваходзяць у саюз, аспрэчылі гэта рашэнне ў Вярхоўным судзе. Але іх аргументы не былі пачуты.

Вердыкту Вярхоўнага суда папярэднічалі спрэчкі бакоў. У сваім выступленні лідэр Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін указаў, што ўжо не ўпершыню ён сутыкаецца з агульным падыходам Мінюста да заканадаўства. Паводле яго слоў, законы заклікаць задавальняць канстытуцыйныя правы грамадзян на свабоду аб'яднанняў і ўступлення ў палітычныя партыі, і Міністэрства юстыцыі не можа забараняць тое, што не забаронена законам. Пры гэтым Калякін заявіў, што ў законе аб палітычных партыях Беларусі няма ніводнай нормы, якая напрамую забараняе правядзенне якіх-небудзь мерапрыемстваў палітычных партый за межамі краіны.

Таксама С.Калякін падкрэсліў, што статуты ўсіх трох палітычных партый — Партыі камуністаў Беларускай, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і Беларускай партыі жанчын "Надзея" — падразумяваюць удзел у канферэнцыях, з'ездах і іншых мерапрыемствах за мяжой.

Лідэр ПКБ падкрэсліў, што ў статутах усіх трох партый ёсць пункты аб каардынацыі дзейнасці паміж палітычнымі партыямі Беларусі ў пытаннях найбольш эфектыўнага развіцця краіны. У сувязі з гэтым ён прасіў Вярхоўны суд прызнаць незаконным рашэнне Мінюста аб адмове ў рэгістрацыі Саюза левых партый і аднесці расходы па правядзенні судовага пасяджэння на рахунак адказчыка.

Прадстаўнік Мінюста Аляксандр Харытон у сваім выступленні не пагадзіўся з доказамі Калякіна. Паводле яго слоў, правядзенне ўстаноўчай канферэнцыі СЛП за межамі Беларусі, у Чарнігаве, гэта парушэнне нормы аб тым, што палітычныя партыі ажыццяўляюць сваю дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. На яго думку, гэты з'езд з'яўляецца ўнутранай справай трох беларускіх палітычных партый і не быў скіраваны на міжнароднае супрацоўніцтва гэтых партый з іншымі структурамі за мяжой.

Таксама ён выказаў шэраг прэтэнзій да статута Саюза левых партый.

Як заявіў БелаПАН пасля вынясення вердыкту Сяргей Калякін, "левыя" ў найбліжэйшы час паспрабуюць правесці аналагічную канферэнцыю на тэрыторыі Беларусі. І тады ў Мінюста не павінна ўзнікнуць ніякіх пытанняў?..

Сяргей ПУЛЬША.

ТАК І СКАЗАЎ

У Мілінкевіча прарасійскі настрой

У беларускай апазіцыі няма антырасійскіх настрояў. Пра гэта, паводле інфармацыі РІА Новости, заявіў на прэс-канферэнцыі ў Санкт-Пецярбургу адзін з лідэраў аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі Аляксандр Мілінкевіч.

"Сярод дэмакратычнага лагера нашай краіны няма і не будзе антырасійскіх настрояў. Я сёння прыехаў з гэтым пасланнем. У нашай краіне антырасійскі палітык ніколі не зможа выйграць выбары", — сказаў А.Мілінкевіч.

Ён таксама звярнуў увагу на неабходнасць змянення палітыкі ў сферы стварэння Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. *"Мы не пачалі з эканомікі, а эканамічная сітуацыя паміж Расіяй і Беларуссю ўсё горш і горш"*, — сказаў палітык.

Каментуючы заяву Аляксандра Лукашэнкі аб неабходнасці пераарыентавання знешняй палітыкі ў бок Еўрасаюза, паколькі ў той бок накіравана большая частка экспарту дзяржавы, А.Мілінкевіч адзначыў, што краіна *"не гатова да еўрапейскай канкурэнцыі, да еўрапейскай эканомікі"*.

Ён дадаў, што большая частка экспарту ў Еўропу — гэта пастаўкі нафтапрадуктаў, атрыманых з расійскай нафты, якая "была падарункам" з боку Расіі.

"Трэба быць і з тымі, і з іншымі. Калі з Расіяй да апошняга часу былі някепскія адносіны, дык з Еўропай мы самі пабудавалі кітайскую сцяну", — лічыць А.Мілінкевіч.

Каментуючы магчымасць будаўніцтва нафтаправода ў Еўропу ў абход Беларусі, палітык адзначыў, што Беларусь *"з-за свайго шантажу пазбавіцца магчымасці зарабіць добрыя грошы". "Але я абвінавачваю ў гэтым у першую чаргу нашу ўладу"*, — заявіў ён.

Кацярыну Садоўскую могуць вызваліць

Пра магчымасць умоўна-датэрміновага вызвалення 60-гадовая Кацярына Садоўская напісала ў апошнім лісце дамоў.

Кацярына паведаміла мужу, што камісія Гомельскай жаночай калоніі рэкамендавала вызваліць яе ўмоўна-датэрмінова. Магчыма, ужо ў красавіку вядомая праваабаронца зможа выйсці на волю.

23 кастрычніка 2006 года суд Ленінскага раёна Мінска асудзіў 60-гадовую Кацярыну Садоўскую да двух гадоў зняволення з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму. Падставай для крымінальнай справы стаў неадпраўлены ліст, знойдзены падчас вобыску ў кватэры жанчыны, у якім яна абвінаваціла кіраўніка дзяржавы ў крымінальных злачынствах і назвала яго "монстрам". Мовазнаўчая экспертыза вырашыла, што ўжытае слова з'яўляецца параўнаннем з жывёлай і абражае асобу.

Паводле судовага рашэння, Кацярына Садоўская абавязана выплаціць 4 мільёны рублёў у якасці маральнай кампенсацыі суддзям Кіраўскага раённага суда Чмары і Уліцінай плюс пагасіць усе судовыя выдаткі.

Дзеці, муж-інвалід, 85-гадовая маці Кацярыны Садоўскай не чакалі такога жорсткага прысуду (пра смерць маці К.Садоўская дведалася з тэлеграмы мужа). Тым больш што год таму, якраз у красавіку, жанчына перанесла анкалагічную аперацыю.

"Узялі падпіску, што нікога не будзе зневажаць. Піша, што ў калоніі было пасяджэнне спецыяльнай камісіі, якая рэкамендавала ўмоўна-датэрміновае вызваленне", — кажа муж Віктар Садоўскі.

Судовая практыка ведае выпадкі, калі зняволеных вызвалялі яшчэ да таго, як яны адбудуць палову тэрміну зняволення. Да прыкладу, асуджаны на два гады зняволення адзін з лідэраў грамадзянскай ініцыятывы "Партнёрства" Мікалай Астрэйка выйшаў на волю праз 9 месяцаў; зняволенне замянілі на папраўчыя працы.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ПАЛІТКУХНЯ

Лідэры далі слова джэнтльменаў

— Можаце нам паапладзіраваць, пагадненне ўсё-такі дасягнута.

Старшыня АГП Анатоль Лябедзька відавочна быў задаволены вынікамі шматгадзінных дэбатаў у Вільнюсе. Дэмакраты нарэшце дамовіліся аб адзіным сцэнарыі дзеянняў. Амаль дзесяць гадзін ішлі спрэчкі, лідэры партый сустракаліся і адзін на адзін, і з прадстаўнікамі рэгіёнаў; пакуль без сведкаў дамаўляліся Калякін, Лябедзька, Вячорка і Мілінкевіч, іх прыхільнікі ў вялікай зале ледзь не хапалі адзін аднаго за чубы, але вынік, здаецца, задаволіў усіх.

Канферэнцыя, якая адбылася ў Вільнюсе, павінна была альбо паставіць кропку ў расколе паміж беларускімі аб'яднанымі дэмакратамі, альбо канчаткова яго зафіксаваць. Як неаднойчы паведамляла "Народная воля", прычынай расколу стала рознае стаўленне лідэраў да неабходнасці праводзіць Кангрэс дэмакратычных сіл і пытанняў, якія на яго выносяцца.

Гульня амбіцый

"Кангрэс неабходна праводзіць тэрмінова, мы і так спазніліся", — сцвярджалі Калякін (камуністы), Лябедзька (АГП), Ляўковіч (сацыял-дэмакраты Казуліна), Бухвостаў (былая Партыя працы), Яськова (партыя жанчын "Надзея"). "Кангрэс не патрэбен", пазней — "Кангрэс патрэбен, але не трэба спяшацца", — выступалі Аляксандр Мілінкевіч, Віктар Карняенка ("За свабоду!", які стварае Мілінкевічам), Станіслаў Шушкевіч (ужо другія сацыял-дэмакраты), Уладзімір Навасяд (які стварае Партыю свабоды і прагрэсу), прадстаўнікі Міколы Статкевіча (трэція сацыял-дэмакраты), Партыя зялёных, незарэгістраваны "Малады фронт". І з асобнай пазіцыяй выступаў лідэр БНФ Вінцук Вячорка, які прапанаваў свой *"кампраміс дзеля адзінства"* і пры галасаваннях пачаў падымаць абедзве рукі — і за адных, і за другіх (дарэчы, і ў Партыі БНФ меркаванні наконт сітуацыі падзяліліся, што дазваляла гаварыць аб пагрозе расколу).

Такім чынам, атрымлівалася, што рашэнні асноўных партый блакіруюцца *"палітычнымі карлікамі"*, бо ні па колькасці, ні па актыўнасці нельга параўнаць тую ж Партыю зялёных і, напрыклад, АГП. Такім чынам, бомба запаволенага дзеяння была закладзена яшчэ пры фарміраванні палітсавета аб'яднаных дэмакратычных сіл, калі галасы розных па палітычнай вазе ігракоў былі ўраўнаваны. І бомба выбухнула, хаця спачатку здавалася, што дэмакраты дамовіліся.

Агульным рашэннем палітсавета было наступнае: Кангрэс дэмакратычных сіл павінен прайсці, бо трэба вызначыцца з далейшай стратэгіяй дзеянняў і вырашыць праблему лідэрства. Мілінкевіча ж абіралі *"адзіным кандыдатам"* у прэзідэнты, а не навечна адзіным лідэрам дэмакратычных сіл. Выбары даўно скончыліся, а дакладней — праваліліся, які зараз ягоны статус?

Зразумела, што ў кожнага з палітычных лідэраў свае амбіцыі і кожнаму хочацца, каб на чарговым Кангрэсе большасць дэлегатаў былі ягонымі прыхільнікамі, бо толькі так па выніках галасавання можна атрымаць статус лідэра ўсіх дэмакратаў. Дамовіліся і пра тое, хто будзе дэлегатам Кангрэса: кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў і ўсе тыя, хто па сваіх акругах збярэ больш за трыста подпісаў пад адзіным заклікам дэмакратаў да грамадства. Нават стварылі спецыяльную назіральную камісію, якая (па прыкладзе Цэнтрвыбаркама) павінна будзе правяраць усе подпісы і альбо прызнае чалавека дэлегатам Кангрэса, альбо адмовіць яму.

Але вось назіральная камісія падвяла першыя вынікі. Высветлілася наступнае: большасць дэлегатаў Кангрэса складуць прыхільнікі Сяргея Калякіна (не толькі камуністы, але і прадстаўнікі ўсяго "левага блока"), папярэдне Мілінкевіч і Лябедзька атрымліваюць значна менш галасоў, паколькі сімпатыі дэлегатаў ад Партыі БНФ падзяліліся. Такім чынам, ніхто (акрамя Калякіна, і то з нацяжкай) не атрымаў, чаго хацеў.

Тады ўзнікла прапанова наогул зняць пытанне лідэрства з парадку дня дэмакратычнага форуму. Зараз жа не прэзідэнцкія выбары, абавязкова вызначацца з адзінай кандыдатурай не трэба, і калі пытанне лідэрства расколвае дэмакратаў, дык не трэба яго і ўзнімаць: будуць выбары — будзе іншая размова.

Але Аляксандр Мілінкевіч і яго прыхільнікі, якія па інерцыі і пасля выбараў адыгрывалі першую ролю ў дэмакратычным асяродку, катэгарычна не пагадзіліся з такім рашэннем. Іх довад: павінен быць чалавек, які кіруе апазіцыяй і адказвае за эфектыўнасць яе дзеянняў, моцнай уладзе павінна супрацьстаяць моцная апазіцыя... Іншымі словамі, Кангрэс павінен абраць лідэра.

Пасля кансультацый паміж сабой партыйныя лідэры пагадзіліся з Мілінкевічам, маючы на ўвазе, што па раскладзе сіл лідэрам на Кангрэсе будзе абраны Калякін. Але ў Мілінкевіча тут як тут з'явілася новая ўмова: трэба перагледзець склад дэлегатаў Кангрэса. Па-першае, абралі немаведама каго, подпісы шмат у каго падробленыя; па-другое, расклад сіл у грамадстве значна шырэйшы, ёсць арганізацыі, якія не ўдзельнічалі ў выбарах, але за імі — вялікая колькасць людзей, іх прадстаўнікі павінны быць дэлегатамі Кангрэса.

І вось тут ужо асноўныя партыі сказалі адназначнае "не". Справа ў тым, што Мілінкевіч перамог пры выбары адзінага кандыдата менавіта дзякуючы таму, што ў Мінск з'ехаліся прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, у тым ліку тыя, хто ніколі не ўдзельнічаў у палітыцы. Яны прагаласавалі за свайго стаўленіка і ў большасці ціхенька паехалі па дамах займацца тым, чым займаліся раней, — што не мае да палітыкі аніякага дачынення. Дык з якой такой радасці даваць гэтым людзям той самы голас, што будуць мець тыя, хто пераараў сваю акругу, як кажуць, уздоўж і ўпоперак?

"Альбо адно, альбо другое, — заявілі партыі. — *Альбо выбіраем лідэра, альбо запрашаем на Кангрэс усіх, нават тых, хто не ўдзельнічае ў палітычных кампаніях, але пытанне лідэрства здымаецца з парадку дня"*.

Аляксандр Уладзіміравіч не пагадзіўся. Разам з ім не пагадзіліся і Шушкевіч, Статкевіч, Навасяд... Колькасць іхніх прадстаўнікоў у ліку дэлегатаў, як вы разумееце, непараўнальна меншая, чым амбіцыі лідэраў, таму прапановы Мілінкевіча ім прыйшліся даспадобы.

Вось ён і ўзнік, той самы тупік, з якога, здавалася, не будзе выйсця.

...і загучалі апладысменты

— Сяргей Іванавіч, кажуць, большасць вашых сярод дэлегатаў Кангрэса — гэта чыстая ліпа? — правакацыйна запыталася я ў Сяргея Калякіна, бо ў Інтэрнеце распаўсюджвалася інфармацыя, нібыта назіральная камісія, блізкая да Мілінкевіча, прызнала спісы, прадстаўленыя камуністамі, фальшывымі, зробленымі ледзь не адной рукой і ледзь не пад кальку.

— Я не біўся ні за аднаго свайго чалавека, хаця многіх абвінавацілі зусім дарэмна. Каго зацвердзілі — таго зацвердзілі.

— І Вы ўсё роўна настойваеце на правядзенні Кангрэса?

— Так, бо трэба рухацца далей, зараз людзі проста не разумеюць, што рабіць. Але я ўпэўнены, што нельга выносіць пытанне лідэрства, такая пастаноўка азначае раскол.

— А калі Мілінкевіч не пагодзіцца?

— ...

...Я не ведаю, што адбывалася за зачыненымі дзвярыма, дзе вялі перамовы Мілінкевіч, Лябедзька, Калякін і Вячорка, але ў агульнай зале жарсці кіпелі. Разоў з пяць выступаў Станіслаў Шушкевіч, з ім спрачаўся Юрый Хадыка, падскокваў са сваімі рэмаркамі Віктар Карняенка і з выглядам вопытнага педагога ментарскім тонам вяшчаў Анатоль Ляўковіч... Толькі Алена Яськова амаль не ўмешвалася ў дыскусію і — адно — цяжка ўздыхала. Здавалася, нічога не будзе, ніякага паразумення. У кожнага свая праўда, свае довады, свае аргументы.

Раптам да *"чацвёркі"* галоўных перамоўшчыкаў паклікалі астатніх членаў палітсавета.

— Ну што там? — пытаюся ў Алены Скрыган, якая паспела перакінуцца парай слоў з Сяргеем Калякіным.

— Дамовіліся, што Кангрэс будзе. Перад ім пройдуць сходы дэлегатаў ва ўсіх абласцях, на якіх і будзе прынята рашэнне, ці выносіць на Кангрэс пытанне лідэрства.

— Мілінкевіч пагадзіўся?

— Супраць, — уздыхнула Алена Мікалаеўна.

Такім чынам, нічога добрага асабіста я ад вынікаў пасяджэння палітсавета ў Вільнюсе не чакала. Але праз некаторы час з'явіліся ўсе лідэры і абвясцілі: *"Пагадненне дасягнута"*. Кангрэс пройдзе, і будзе зроблена ўсё магчымае, каб ён адбыўся ў маі. Усе спрэчныя пытанні будуць вынесены на абласныя сходы. Дэлегатамі Кангрэса з'яўляюцца тыя, чые паўнамоцтвы прызнала Назіральная камісія, кандыдаты ў дэпутаты Нацыянальнага сходу на выбарах 2004 года і тыя, хто быў абраны дэлегатам на мінулы Кангрэс на сходах дэмакратычнага актыву. Акрамя таго, кожная вобласць атрымоўвае дадатковую квоту ў 7 чалавек на VIP-дэлегатаў. Усе лідэры даюць слова джэнтльмена, што пагодзяцца з вынікамі Кангрэса, якімі б яны ні былі...

Вось тут Анатоль Лябедзька і параіў усім паапладзіраваць. І сапраўды загучалі апладысменты.

...Як высветлілася пазней, справу вырашыла тое, што на гэты раз Вінцук Вячорка галасаваў не абедзвюма рукамі, а толькі адной — за кампрамісныя прапановы Лябедзькі і Калякіна. Бліжэй да вечара страціў запал і жаданне спрачацца і Станіслаў Шушкевіч. У выніку рашэнне было прынята. І Аляксандр Мілінкевіч таксама прагаласаваў "за".

Святлана КАЛІНКІНА.

Вільнюс—Мінск.

Ад рэдакцыі.

Зразумела, што сам па сабе Кангрэс — пройдзе ён, ці не — гэта не самае галоўнае. Галоўнае — якую стратэгію выберуць дэмакраты, што яны прапануюць грамадству. Якой канкрэтнай штодзённай працай яны пацвердзяць жыццядзейнасць сваіх ідэй, планаў, праграм. У бліжэйшых нумарах мы раскажам аб гэтым і прапануем вам інтэрв'ю з распрацоўшчыкамі стратэгіі дзеянняў дэмакратычных сіл і з тымі, хто працаваў над эканамічнай праграмай.

У Мінску апаганілі магілу Кузьмы Чорнага

На Ваенных могілках Мінска невядомыя апаганілі магілу класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага (24.06.1900—22.11.1944). Пра гэта паведаміў старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) Алесь Пашкевіч.

Паводле яго слоў, інфармацыя аб здарэнні паступіла ў офіс творчага аб'яднання напярэдадні Радаўніцы, раніцай 16 красавіка. *"Калі мы прыйшлі на магілу пісьменніка, дык убачылі сляды невядомых, якія тапталіся па металічнай лаўцы ля магілы, а таксама сарваную брамку разам з завесамі, прываранымі да стойкі агароджы. Сам помнік з чорнага граніту не пацярпеў"*, — сказаў А.Пашкевіч. Чалавек, які паведаміў аб здарэнні, прыбраў магілу ад смецця, дадаў старшыня СБП.

К.Чорны пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі і Беларускага дзяржуніверсітэта працаваў у рэдакцыі газеты "Беларуская вёска", галоўным рэдактарам часопіса "Узвышша", з'яўляўся членам літаб'яднання "Маладняк" і старшынёй літаб'яднання "Узвышша". Займаючы пасаду загадчыка кабінета маладога аўтара пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі, К.Чорны быў беспадстаўна арыштаваны 14 кастрычніка 1938 года і да 8 чэрвеня 1939 года знаходзіўся ў турме. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны — у эвакуацыі ў Маскве, дзе ўдзельнічаў у выданні плаката-газеты "Раздавим фашыстскую гадину". Летам 1944 года вярнуўся ў Мінск і працаваў у часопісе "Беларусь".

Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.

СУД ДЫ СПРАВА

Дзяніс Дзянісаў глытнуў вольнага паветра

16 красавіка заканчваецца следства па крымінальнай справе супраць Дзяніса Дзянісава. Пасля дакументы пойдуць у Кастрычніцкі райсуд Віцебска. Хлопцу пагражае да трох гадоў зняволення.

Пад заклад у 7,5 тысячы долараў з Віцебскага следчага ізалятара №2 11 красавіка адпушчаны на волю грамадскі актывіст Дзяніс Дзянісаў. Адпушчаны да суда. Маладога чалавека абвінавачваюць у парушэнні артыкула 342 Крымінальнага кодэкса — "арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх".

9 красавіка Дзяніс Дзянісаў у следчым ізалятары №2 Віцебска адзначыў свой дзень нараджэння. Гэтым жа днём яго маці Раіса Дзянісава пералічыла на рахунак "Беларусбанка" пятнаццаць з паловай мільёнаў, ці 7,5 тысячы долараў. Грошы два тыдні збіралі больш за сто чалавек. Аднак юнак быў вызвалены з санкцыі Віцебскага абласнога пракурора толькі праз два дні...

Дзяніса Дзянісава сустракалі сваякі, сябры, журналісты. Найбольшую асалоду хлопец, які пакінуў сцены турмы, адчуў ад свежага паветра. "Свежае паветра — гэта так добра! Вялікі дзякуй тым людзям, хто збіраў грошы, вялікі дзякуй за лісты і віншаванні з днём нараджэння! Прычым большасць лістоў была ад людзей, з якімі я не знаёмы! За ўвесь час я змяніў сем ці восем камер, і паўсюль да мяне ставіліся добра", — сказаў на парозе СІЗА Дз.Дзянісаў...

Дзяніса Дзянісава затрымалі 18 чэрвеня 2006 года ў Віцебску, калі ў горадзе з'явіўся бел-чырвона-белы сцяг і графіці з расцяжкамі "Бунт". Крымінальную справу ў дачыненні да Дзяніса Дзянісава завялі ў кастрычніку 2006 года. Аднак затрымалі юнака толькі 16 лютага 2007 года ў цягніку на Гомель. Тыдзень хлопца пратрымалі ў Гомельскім следчым ізалятары, пасля — перавялі ў Віцебск, у следчы ізалятар №2.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

Крымінальны кодэкс

Артыкул 342. Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх.

1.Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаных з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады ці пацягнулі за сабой парушэнне працы транспарту, прадпрыемстваў, устаноў ці арганізацый, альбо актыўны ўдзел у такіх дзеяннях пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства — караюцца штрафам, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, альбо абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

ДИКИЙ СЛУЧАЙ

Нокаут от учителя

Учительница так избила одиннадцатилетнего ученика, что он оказался в больнице

Вот что рассказала мама **Никиты СТОЯНОВИЧА:**

— По национальности мы цыгане. Мой супруг — индивидуальный предприниматель, занимается изготовлением хомутов. Я помогаю ему в работе и веду хозяйство. У нас трое детей-школьников, которых мы воспитываем в строгости.

30 марта на перемене после первого урока одноклассники забрали физкультурную форму Никиты и стали ею перебрасываться. Мой сын увидел это и попытался отобрать у них свои вещи. Его дразнили, форму не отдавали. Видимо, поэтому он разозлился и запустил обувью в одного из своих обидчиков. Но тот пригнулся и один кед попал в стоящее на столе растение, которое сломалось. Дети выскочили в коридор и позвали в класс проходившую мимо учительницу математики Ирину Рышардовну Полуянскую. Она разбираться не стала, схватила большой треугольник и начала бить им Никиту по ногам. Тот кричал, что ему больно... В один из моментов сын по вине учительницы ударился лбом о стенку. Дав ему подзатыльник, женщина вышла из класса. Когда Никита шел домой, он потерял сознание и неизвестно сколько пролежал на земле. Его подняли и отвели домой. Мы с мужем появились дома только около 17 часов. Сын лежал на диване, на лбу была багрово-синяя шишка. Глаза красные, его постоянно тошнило. На вопросы отвечать он не мог, только плакал. Мы вызвали "Скорую помощь". Сыну сделали укол и увезли в больницу. Я сразу же написала заявление в милицию.

Уже на следующий день произошедшее успело обрасти сплетнями и выдумками... Был целый класс свидетелей, но начали говорить, будто Никиту побили дома, а в школе ему из-за этого стало плохо. Состоялся разговор в школе, затем в милиции, и мы с мужем стали опасаться, что дело хотят замять. Поэтому мы просили заведующего больницей позволить нам свозить сына на судебно-медицинскую экспертизу в Пружаны. А заведующий Ружанской больницей Николай Максимов ответил, что наш ребенок в тяжелом состоянии, мол, от поездки ему станет хуже... Однако на следующий день он выписал Никиту, хотя ребенок жаловался на сильную головную боль. Нам ничего не оставалось, как забрать сына. Но так как мы видели, что он в плохом состоянии, отвезли его в больницу соседней области. Куда именно, я не хотела бы говорить... Сейчас с ним муж.

Вечером того дня, когда все произошло, учительница, избившая Никиту, приходила к нам. Предлагала различные способы, как уладить дело. Мы с ней разговаривать не стали. Сейчас я не могу своих детей отправить в школу... Во всяком случае до тех пор, пока там работает Полуянская, избившая моего ребенка, они туда не пойдут.

Анжелика Николаевна утверждает: о случившемся в тот день в классе она узнала, опросив одноклассников сына. Корреспонденту довелось побеседовать с некоторыми детьми значительно позже, уже после того, как в школе побывал участковый инспектор.

— Я видела, как математичка била Никиту треугольником по ногам, — говорит ученица 5 "Б" класса Настя Морозевич. — А как у него появилась шишка на лбу, я не знаю. Когда я повернулась, то увидела, что Никита лежит на полу, а учительница выходит из класса. Потом она стояла в коридоре, что-то обсуждала с другими учителями, смеялась...

Оксана Анатольевна, мама ученика 5 "Б" класса Андрея Баранова:

— Дома сын заговорил о произошедшем в школе. При этом голос его дрожал, ребенок был очень взволнован. Одно воспоминание о случившемся вызвало у него стрессовое состояние. Он сказал, что, когда учительница стала бить Никиту, некоторые дети смеялись, а ему было жалко.

— Учительница дала Никите по затылку, и он со всего размаху стукнулся о выступ в стене, — вспоминает Андрей Баранов. — Позже он попросился сходить в медпункт, его не сразу, но отпустили с урока. Но Никита пошел домой, оставив портфель и физкультурную форму в классе. Его вещи забрал старший брат.

Что было потом, рассказывает **Николай ВОЛОШИН:**

— В ту пятницу в одиннадцатом часу мы с двоюродным братом шли в сторону рынка. Вокруг было много народу. Случайно увидели, что на газоне недалеко от почты лежит мальчик. Склонились над ним и узнали в нем Никиту, окликнули его по имени. Ребенок был в полусонном состоянии, мы так и не поняли, что с ним. Лоб у него с правой стороны был побит. Подняли его, взяли за руки и повели к дому. Все это я рассказывал участковому инспектору.

Директор Ружанской СШ **Галина ВЕРХОВЕЦ** оправдывать свою подчиненную не стала, считая, что за совершенное она должна ответить.

— Ясно только одно: у учителя произошел нервный срыв, — считает Галина Николаевна. — В нашей школе она работает с 1986 года. Ранее на нее не поступало жалоб ни от учеников, ни от их родителей. Сразу после случившегося Полуянская поехала в отдел образования Пружанского райисполкома и подала заявление на увольнение. Ее просьбу удовлетворили.

Прокомментировать эту ситуацию корреспондент попросила начальника отдела образования райисполкома **Николая КУДРОВЦА**:

— Выявленные обстоятельства свидетельствуют о том, что учительница поступила антипедагогично и в школе ей не место. Ее заявление об увольнении мной подписано потому, что не было необходимости удерживать ее на работе. Преподаватель математики она не самый сильный. Искать ей замену не нужно, так как в Ружанской школе есть молодой специалист, преподаватель математики, у которого небольшая нагрузка.

Наверное, всем нам сегодня доводится слышать о том, что школьники бывают просто неуправляемы, ведут себя так, что учителю действительно очень сложно держать себя в руках. Но вот как характеризует Никиту Стояновича классный руководитель 5 "Б" класса **Светлана ГЕРАСИМУК**:

— Особых претензий по дисциплине к Никите нет. Бывает, он пропускает уроки, слабовато учится. Но могу сказать, что в классе есть дети намного хуже его и по успеваемости, и по поведению.

Выходит, вспышка ярости у педагога произошла, по сути, беспричинно. Неужто сломанное растение и стало поводом для рукоприкладства? И все же меня постоянно мучила мысль: наверняка нечто важное осталось за кадром. Может быть, преподаватель сразу не сказала об этом, а теперь по прошествии времени, все обдумав и взвесив, не станет ничего утаивать. Но Ирина Полуянская так и не смогла пролить свет на эту историю.

— Я не знаю, почему так произошло, — пояснила она. — За день до этого Никита расстроил меня тем, что на уроке играл мобильным телефоном, а на мои замечания не реагировал. Если бы он не стал со мной пререкаться, когда я отругала его за сломанное растение, я бы не сорвалась. Не думала, что он ударится лбом о выступ в стене. Это стечение обстоятельств.

Сколько за одного битого дадут?

Нашло ли документальное подтверждение состояние, в котором, по словам Анжелики Николаевны, находится Никита? Заведующий Ружанской больницей Николай Максимов считает, что в госпитализации ребенок вообще не нуждался. Он утверждает: мальчика положили в больницу исключительно по настоянию его родителей.

— После обследования было решено, что имеет место только ушиб головы, — поясняет Николай Максимович. — Первоначальная версия о сотрясении мозга не подтвердилась, никаких его симптомов у ребенка не возникло. При диагнозе "ушиб головы" предписывается госпитализация на три дня. Никита находился в больнице четыре дня. Сделаны рентгенография и анализы. Проводить экспертизу, как того требовали родители, не было смысла. Милиция в подобных случаях изымает историю болезни, где все зафиксировано. Направлять ребенка на обследование в областную больницу также не было никаких оснований...

Но когда заведующий узнал от корреспондента, что в данное время Никита Стоянович находится на лечении в одной из больниц, то изменился в лице. Стал расспрашивать, в какой именно. Потом настоятельно порекомендовал узнать мнение невролога Василия Товстика о его состоянии. Корреспондент рекомендации вняла и теперь может заверить: ружанские врачи в своем мнении по поводу удовлетворительного состояния ребенка оказались единодушны.

Так какова же официальная версия произошедшего 30 марта в Ружанской СШ, основанная на показаниях свидетелей и медицинском заключении? Отвечает на этот вопрос участковый инспектор Ружанского поселкового отделения милиции **Александр СЕМАКОВИЧ**:

— Установлено, что учительница била Никиту Стояновича треугольником по ногам и мягким тканям. По свидетельству его одноклассников, тот нецензурно выругался. Учительница дала ученику подзатыльник, в результате чего он ударился лбом о выступ в стене, и на лбу у него образовалась ссадина. Она квалифицирована как легкие телесные повреждения, не повлекшие за собой кратковременного расстройства здоровья. На педагога составлен административный протокол, который передан в суд. В возбуждении уголовного дела отказано. Но судебный процесс приостановлен до выписки из больницы Никиты Стояновича и приобщения к делу нового медицинского заключения.

На днях мама Никиты сообщила, что ее сын из больницы выписан, но еще два месяца должен принимать лекарства и год наблюдаться у невролога. По ее словам, гродненские врачи дали заключение, что у мальчика сотрясение головного мозга. Ребенка на целый месяц освободили от посещения занятий в школе и на два — от уроков физкультуры.

Можно долго морализировать на тему того, что педагог ни при каких обстоятельствах не имеет права на рукоприкладство, что в школе сегодня много случайных людей, но не стану... Последнюю точку в деле об избиении школьника поставит суд.

Алла КОВАЛЕВА.

("Вечерний Брест".)

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 КРАСАВІКА 2007 г.

Выжыць ці памерці?

Менавіта перад такой дылемай пастаўлены і рыначныя гандляры, і іх пакупнікі. Дзень дурня з лёгкай рукі ўлад стаў штуршком да росту цэн на рынках.

Чаму мы ходзім на рынак, а не ў буйныя магазіны ці буцікі? Адказ для простага чалавека відавочны: таму што на рынку ўсё дзешавей. Прычын таго, што мелкі бізнес паспяхова вытрымліваў цэнавую канкурэнцыю з буйным, шмат, але галоўнае — у розніцы падаткаў. Аднак некаму спатрэбілася, каб народ ішоў за пакупкамі ў дарагія магазіны. З іхняй падачы і быў падпісаны сумна вядомы прэзідэнцкі ўказ №760, якім са сферы прымянення адзінага падатку былі выключаны складанабытавыя прыборы і футра, і наогул пад пагрозай існавання аказаўся бізнес большасці дробных гадляроў, бо ім будзе забаронена наймаць на работу тых, хто не з'яўляецца блізкім сваяком. Акрамя таго, ад Дня дурня ўступілі ў сілу і новыя правілы гандлю парфумерыяй і касметыкай. Новаўвядзенні ўжо прывялі да скарачэння асартыменту тавараў, росту цэн (мінімум на 20—25%) і скарачэння колькасці гандляроў. Хто пацярпеў? Мы з вамі. І тое, што адбываецца зараз, — гэта яшчэ далёка не ўсе "сюрпрызы", з якімі прыйдзецца сутыкнуцца. Па крайняй меры, у гэтым упэўнены старшыня Каардынацыйнага савета прадпрымальнікаў Мінска Аляксандр Макаеў, разам з якім карэспандэнт "Народнай волі" прайшоўся па мінскіх рынках.

Парфумерыя знікае з рынкаў

Купіць імпартную парфуму ужо праблема, хаця духі яшчэ можна сустрэць на рынках. Прадпрымальнікі распрадаюць старыя запасы.

Новыя правілы гандлю парфумерна-касметычнымі вырабамі устаноўлены прэзідэнцкім дэкрэтам № 20, якім з 1 красавіка ўведзена ліцэнзаванне рознічнага гандлю і імпарту нехарчовай прадукцыі з утрыманнем спірту. Духі, адэкалоны, ласьёны, туалетная вада — усё гэта ўтрымлівае спірт, хаця, зразумела, што нікому не прыйдзе ў галаву замест гарэлкі выпіць Hugo Boss. Але колькі ні было размоў пра абсурднасць палажэння дэкрэта, індывідуальныя прадпрымальнікі свабодна гандляваць парфумай ужо не могуць. Ім трэба атрымаць спецыяльную ліцэнзію.

На сённяшні дзень рабіць аптовыя закупкі парфумерыі могуць 35 буйных фірм — яны маюць складскія памяшканні не менш за 1 тысячу квадратных метраў, і ў іх на рахунках ёсць не менш за 500 тысяч долараў ЗША. Зразумела, што дробны бізнес выканаць такія патрабаванні ніколі не зможа, таму буйныя фірмы і будуць дыктаваць узровень цэн. Аляксандр Макаеў тлумачыць: "Па кожным найменні парфумерыі патрэбна заключаць асобны кантракт (на закупку 400 назваў парфумерыі трэба заключаць 400 кантрактаў, кожны з якіх — ад 10 тысяч долараў). Такіх сродкаў сёння ні адзін прадпрымальнік не знойдзе. Больш за тое, сёння аптовыя цэны перавышаюць нашы рознічныя, таму скачок цэн на парфумерыю непазбежны. Магчыма, гандаль набудзе росквіт з-пад крыса, ці, мякка кажучы, падпольна".

— Але вось нешта прадаецца?

— Гэта рэшткі таго, што індывідуальныя прадпрымальнікі закупілі раней. Дробныя бізнесмены мусілі задэклараваць у падатковых інспекцыях гэтыя рэшткі, зараз іх распрадаюць, але запасаў хопіць не надоўга. Магчымы выхад — прадпрымальнікі будуць закупляць прадукцыю на фірмах-пастаўшчыках і падкладваць яе пад тое, што маюць як рэшткі. Але такія дзеянні — відавочная самападстава пад адміністрацыйнае і крымінальнае заканадаўства.

Чым жа не спадабалася футра?

Для вырабаў з футра, дакладней, для гандляроў такой прадукцыяй, наступаюць таксама складаныя часіны. Прэзідэнцкім указам №119 уведзены падатак у памеры 10% ад тавараабароту. Акрамя гэтага — ПДВ, мытныя зборы, гербавыя зборы і шэраг іншых падаткаў; а таксама павінен быць такі ўлік, які, акрамя бухгалтара, ніхто зрабіць не зможа. Значыць, трэба наймаць на работу бухгалтара. І ў выніку ўсе гэтыя расходы "ўкладуцца" ў цану. Дык што ж дзівіцца таму, як падаражэлі вырабы з футра?

Міністэрства па падатках і зборах ад пачатку было супраць уключэння вырабаў з футра ў гэты пералік: футравыя вырабы давалі за год большасць з агульнай сумы падаткаў, дык навошта ж забіваць курыцу, якая нясе залатыя яйкі? Але да меркавання міністэрства ніхто не прыслухаўся. *"Замест соцень мільёнаў долараў у выглядзе падаткаў, з увядзеннем новых правілаў дзяржаўная казна атрымае кукіш з маслам, бо юрыдычныя асобы будуць мінімізаваць падаткі, а прыбытак перакачуе ў кішэні буйных фірм і чыноўнікаў, якія лабіруюць іхнія інтарэсы",* — лічыць Аляксандр Макаеў.

Камп'ютэрны дыванок — таксама «складанабытавая» тэхніка

Радыёрынак таксама ліхарадзіць. Яшчэ да 1 красавіка людзі пачалі падчыстую "змятаць" тэлевізары, радыёапаратуру. ІП, якія гандлююць імпартнай складанабытавой тэхнікай (тэлевізарамі, халадзільнікамі, пральнымі машынамі, камп'ютэрамі, мабільнымі тэлефонамі), мусяць заплаціць у дзяржказну падатак на 15—20% большы, чым раней. Зразумела, што гэта таксама адбілася на цэнах. Не трэба быць вялікім эканамістам, каб зразумець, што цэны сталі роўна настолькі ж большымі. Ужо цяпер на рынках (у Ждановічах, напрыклад, 20% індывідуальных прадпрымальнікаў гандлююць менавіта гэтай катэгорыяй тавараў) адбыўся рост цэн на 20—30 працэнтаў, але ёсць выпадкі скачкоў цэн у разы. Прычым абурае людзей тое, што ў афіцыйных дакументах адсутнічае дакладнасць у вызначэнні паняцця "складанабытавая тэхніка": дываток пад камп'ютэрам таксама падпадае ў разрад складанабытавой тэхнікі. Ці не глупства?

Хто аплачвае, той і заказвае музыку?

"Я не ўпэўнены, што дзяржаўныя пратэжэ, інакш кажучы, буйныя фірмы здолеюць насыціць рынкі так, як гэта рабілі індывідуальныя прадпрымальнікі. Больш за тое, новаўвядзенні вядуць да росту сацыяльнай напружанасці. Альбо, калі казаць проста, да беспрацоўя значнай часткі тых, хто зарабляе на жыццё сваёй сям'і менавіта гандлем на рынках", — мяркуе Аляксандр Макаеў.

Гэты тэзіс пацвярджаецца лічбамі. Улады заяўляюць, што на рынках працуюць 187 тысяч прадпрымальнікаў і 32 тысячы малых прадпрыемстваў. У сувязі з новымі патрабаваннямі прадпрымальнікам трэба станавіцца прадпрыемствамі — інакш ніяк. Але не так проста гэта зрабіць, у першую чаргу з-за таго, што прадпрыемства — гэта цэлая бухгалтэрыя са штатам і пячаткамі. Як пракарміць?

"760-ы ўказ робіць стратнай дзейнасць больш за 100 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў, — падлічыў Аляксандр Макаеў. — Куды пайсці, куды падацца гэтай арміі людзей, якія забяспечваюць не толькі сябе, але даюць працу яшчэ 300 тысячам наёмных работнікаў?"

Ці адкажуць распрацоўшчыкі дакумента на гэтыя пытанні? Іх не цікавяць лёсы людзей, толькі лічбы прыбыткаў бюджэту? Дык ніякага эканамічнага абгрунтавання і тут няма. Па крайняй меры, нічога ўцямнага ні адна з афіцыйных асоб сказаць не здолела ні прадпрымальнікам, ні журналістам.

Што рабіць?

Прадпрымальніцкія структуры плануюць выпрацаваць механізм прававой ацэнкі прэзідэнцкіх нарматыўных актаў: дэкрэтаў і ўказаў. Яны настроены дабівацца разгляду ці перагляду не толькі канкрэтнага ўказа №760, а ўсіх прэзідэнцкіх указаў і дэкрэтаў, якія тычацца дробнага бізнесу. На Дзень Канстытуцыі, нагадвае А.Макаеў, старшыня Канстытуцыйнага суда Рыгор Васілевіч паведаміў журналістам, што суд гатовы разглядаць нарматыўныя акты прэзідэнта на адпаведнасць Канстытуцыі, але толькі — у межах дзеючага прававога поля. Іншымі словамі, калі гэтага запатрабуе сам Лукашэнка, дэпутаты ці члены Савета рэспублікі, старшыні Вярхоўнага суда ці Вышэйшага Гаспадарчага суда... Дабіцца, каб хто-небудзь з высокіх асоб засумняваўся ў канстытуцыйнасці ўказаў А.Лукашэнкі практычна немагчыма. Таму зараз Каардынацыйны савет ІП Мінска, супольна з іншымі прадпрымальніцкімі структурамі, збірае подпісы індывідуальных прадпрымальнікаў, каб ініцыяваць рэферэндум. Аляксандр Макаеў сцвярджае, што гэта — "справа года".

Акрамя таго, прадпрымальніцкія структуры, адштурхнуўшыся ад заявы старшыні Канстытуцыйнага суда Рыгора Васілевіча, звярнуліся да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, каб яны ініцыявалі зварот у Канстытуцыйны суд дзеля праверкі ўказа №760 на адпаведнасць Канстытуцыі. Бо размова ідзе пра іх выбаршчыкаў. Дэпутаты пакуль маўчаць.

— А ці будуць прадпрымальнікі бунтаваць, мітынгаваць? — пытаюся ў Макаева.

— Прадпрымальнікі мусяць пераадолець страх і раўнадушша, і "ўсім светам" адстойваць свае правы.

(...Мне падалося, што Аляксандр ухіліўся ад прамога адказу.)

Генрых СТАХОЎСКІ.

Вось такая матэматыка

Прадпрымальнік Уладзімір Багданаў працуе на рынку "Ждановічы" пад Мінскам (у народзе — "Лябяжы"). Прадае вырабы з футра. Ці хутчэй прадаваў: цяпер у прадпрымальнікаў, што гандлююць зімовымі таварамі, вымушаны бестэрміновы адпачынак. Пачынаў свой маленькі бізнес, яшчэ працуючы на Мінскім аўтамабільным заводзе. Цяпер перад выбарам: зварочваць свой бізнес ці працягваць?

— З 29 снежня 2006 года па 31 сакавіка 2007 года мы распрадавалі рэшткі тавару. У гэты перыяд мы плацілі падатак, як і ўсе астатнія, і працавалі. Аднак цяпер сітуацыя змянілася. Зараз ІП мусіць аддаваць у дзяржаўную казну ў якасці падаткаў 10% ад усёй сумы тавараабароту, апрача таго, мытныя зборы, ПДВ і многія іншыя плацяжы... Дык што атрымліваецца ў выніку? Да прыкладу, дублёнка каштуе 300 долараў ЗША. Мы іх звычайна купляем у Маскве на "Ізмайлаўскім", "Чаркізаўскім" рынках і на "Лужніках". Каб прывезці тавар у Беларусь, трэба прайсці растаможку — 96 долараў. Плюс 18% ПДВ — яшчэ 54 долары. У цану тавара, зразумела, закладваецца і арэндная плата — гэта яшчэ 150 долараў за гандлёвае месца з правам выкупу. Закладваем і свой прыбытак, плату гандлярам (калі ў каго ёсць) — 42—47 долараў. І ў выніку шуба, дублёнка, якую ў Расіі купілі за 300 долараў, у Беларусі каштуе ўжо 550—600 долараў. А дадайце да гэтага яшчэ 10% ад тавараабароту...

З тыдзень таму міністр гандлю заявіў: усе новаўвядзенні ніяк не адаб'юцца на беларускім спажыўцы. Я проста анямеў! Як жа не адаб'юцца, калі пацерпіць ад гэтага абсурду менавіта спажывец — цэны вырастуць, асартымент скароціцца, ці папросту, выбару тавару не будзе. І ўвогуле: які ідыёт будзе плаціць 600 долараў за дублёнку ці шубу пры нашых заробках?..

Думаеце, гэта ўсё? Ды не ўсё! Мінскі аблвыканкам абавязаў ІП давесці да 30% удзельную вагу беларускіх тавараў у рэалізуемым асартыменце. Многія маюць гэтыя тавары, многія хацелі б прадаваць айчыннае. Ёсць у нас фірмы "Залатое руно", "Снежная каралева", "Каёт", "Бізон", які шыюць вопратку з футра і скуры. Я паездзіў па гэтых фірмах з намерам купіць беларускія тавары па безнаяўным разліку. Але параўнаў цэны — аказваецца, расійскія тавары каштуюць працэнтаў на 20—30 танней, чым беларускія. Беларускія тавары для беларускага спажыўца аказваюцца непад'ёмнымі, тым больш што той жа рынак "Ждановічы" разлічаны на людзей з сярэднім дастаткам і ніжэй за сярэдні.

Зараз на трэцім паверсе ў Ждановічах, дзе месціцца "Мир моды", працуюць толькі павільёнаў пяць, якія гандлююць футрам. Яны распрадаюць рэшту тавараў, новыя ніхто не завозіць... Хачу сказаць, што створаны проста нечалавечыя ўмовы, пры якіх працэнтаў 40—45 ІП проста зменяць сферу дзейнасці. На іхняе месца прыйдуць фірмы-манапалісты, якія, зразумела, зробяць усё магчымае і немагчымае, каб трымаць высокія цэны. Каму ад гэтага лепей? Людзям?.. Дык ці не напісаць нам пайменны спіс тых, каму выгадна?

Прадпрымальнікі не хочуць многага: дайце ім магчымасць проста працаваць. Трэба спрасціць механізм дастаўкі тавараў з трэціх краін на мытную тэрыторыю Беларусі, трэба ўстанавіць гарантаваны парадак дзейнасці — спажывец сам разбярэцца, што купляць...

МЕРКАВАННЕ

«Магутная лабісцка-курупцыйная аперацыя»

Так назваў змяненне правіл працы для дробнага бізнесу старшыня Саюза прадпрымальнікаў Аляксандр Патупа

Нагадаем, дэкрэт прэзідэнта №20 прадпісаў ІП з 1 красавіка 2007 года займацца гандлем парфумерыяй з утрыманнем спірту толькі пры наяўнасці спецыяльнай ліцэнзіі на знешнеэканамічную дзейнасць. А ўказ прэзідэнта №760 фактычна забараніў ім гандаль складанай бытавой тэхнікай і вырабамі з футра: рознічны гандаль гэтай прадукцыяй перастаў быць відам дзейнасці, пры ажыццяўленні якой ІП выплачваюць адзіны падатак.

Як патлумачыў у інтэрв'ю БелаПАН А.Патупа, да канца 2007 года прадпрымальнікі, якія гандлююць парфумерыяй, могуць толькі распрадаваць рэшткі. Набыццё ж ліцэнзіі, паводле яго даных, для ІП не па сілах ні па кошце, ні па колькасці неабходных дакументаў.

Такім чынам, яны *"не могуць завозіць тавар наогул, могуць толькі набываць яго ў фірм, якія маюць такую ліцэнзію"*, канстатаваў кіраўнік БСП. Ён дадаў, што ліцэнзію на імпарт парфумерыі з утрыманнем спірту ў Беларусі маюць 43 фірмы, з іх 35 пагадзіліся працаваць з ІП.

"Але ўстанавіць доўгатэрміновыя кантакты за наяўны час будзе цяжка, гэта значыць, асаблівай перспектывы няма, — падкрэсліў эксперт. — *Да таго ж самі фірмы не вельмі жадаюць мець справу з нестабільнымі кліентамі".*

На думку А.Патупы, прынятыя дзяржавай меры маюць простае тлумачэнне: парфумерыя, электроніка, футра — адны з самых прыбытковых сегментаў рынку. *"Відавочна, што гэтыя сегменты адразаюцца ад канкурэнтаў з выкарыстаннем адміністрацыйных рычагоў,* — сказаў кіраўнік БСП. — *Людзі, якія ажыццяўляюць гэтыя лабісцкія аперацыі, проста разлічвалі, што гэтыя тавары застануцца на паліцах іх крамаў і будуць ісці па магазінных, а не па рыначных цэнах: у залежнасці ад вырабу на 50—200% даражэй".*

Пры гэтым А.Патупа падкрэсліў, што дагэтуль не было дадзена ніякіх абгрунтаванняў згаданых рашэнняў. *"Ніводнай сур'ёзнай абгрунтаванай запіскі з гэтай нагоды мы не бачылі. Таму можам спакойна гаварыць, што гэта — магутныя лабісцка-карупцыйныя аперацыі",* — рэзюмаваў А.Патупа.

Паводле даных Міністэрства эканомікі, на сёння ў Беларусі працуюць 189 тыс. ІП, з якіх 180 тыс. занятыя ў сферы гандлю.

Алена НАВАЖЫЛАВА.

АДУСЮЛЬ

У аэрапортах Беларусі ўзмацняецца пашпартны кантроль

Новае абсталяванне, якое ўжо працуе ў аэрапорце "Мінск-2", дазваляе вызначыць сімптомы падробкі ў пашпартах усіх краін менш чым за адну хвіліну. Таксама спецыяльная праграма правярае наяўнасць даных пасажыра з айчынным "чорным спісам".

Дарэчы, у ім знаходзіцца больш за 80 тысяч чалавек. З розных прычын іх прысутнасць у краіне непажаданая, іншым забаронены выезд з краіны, хтосьці знаходзіцца ў міжнародным вышуку.

Помнік бульбе

Помнік беларускай бульбе з'явіцца ў старыжытным горадзе Заслаўе пад Мінскам.

Памятны знак у гонар бульбы мусіць увекавечыць асаблівыя адносіны беларусаў да свайго галоўнага нацыянальнага прадукту. Лепшы праект незвычайнага манумента будзе адабраны ў выніку конкурсу, які правядзе Беларускі саюз мастакоў.

Нагадаем, што спачатку помнік планавалася паставіць у Мінску.

Супрацоўніку лясгаса вярнулі адрэзаныя пальцы

Чатыры пальцы рукі, якія адрэзала на піларамі 38-гадоваму супрацоўніку лясгаса з Ганцавічаў, удалося вярнуць на месца.

Бяда здарылася напрыканцы дня, калі рабочы распілоўваў драўніну. На лясгаснай машыне пацярпелага даставілі ў Мінск, дзе ў клініцы мікрахірургіі ўрачы прышылі пальцы.

Медыкі лічаць, што яны прыжывуцца, і рука будзе функцыянаваць нармальна, як і раней. Па словах супрацоўніка Баранавіцкай дзяржаўнай інспекцыі працы Генадзя Ніканюка, рабочы атрымаў траўму па прычыне парушэння правілаў бяспекі. Бальнічны ліст рабочаму аплачваюць, на працы ён быў цвярозым.

Па матэрыялах інтэрнет-рэсурсаў.

БЕЛАРУСЬ—РАСІЯ

Грошай можам не дачакацца

Як мы раней паведамлялі, Беларусь папрасіла ў Расіі крэдыт на 1,5 мільярда долараў. Афіцыйнае тлумачэнне: каб кампенсаваць пераход эканомікі на рынкавыя цэны на энерганосьбіты. Гэтыя грошы мы чакаем, як дажджу ў гарачае надвор'е, і, разлічваючы на гэтыя грошы, нават не плацім поўны кошт за газ: "Газпром" атрымоўвае не 110 долараў, як дамовіліся, а толькі 55. Лічылася, што запазычанасць Беларусь пагасіць пасля пагашэння крэдыту. Але...

Першыя перагаворы па ўмовах выдзялення крэдыту прайшлі ў Маскве. Беларускі бок сутыкнуўся з нечаканымі перашкодамі. Абяцалі нам крэдыт на пачатку года, гаварылі, што расійскі ўрад паспрыяе, але раптам усё аказалася не так проста. "Па выніках перамоў у Маскве беларускаму боку было прапанавана знайсці пераканаўчыя аргументы для атрымання крэдыту", — перадаюць расійскія СМІ. Як перадае інфармацыйнае агенцтва ПРАЙМ-ТАСС, расійскі бок не пераканалі аргументы, прадстаўленыя Беларуссю падчас перамоў.

"Неабходнасць атрымання крэдыту Мінск аргументуе павышэннем цэн на пастаўляемыя расійскія энерганосьбіты, а таксама змушаным увядзеннем дзяржаўных субсідый нафтаперапрацоўшчыкам з прычыны стратнасці перапрацоўкі на беларускіх НПЗ у новых умовах", — распавёў суразмоўца агенцтва, блізкі да расійскага ўрада. Аднак расіяне ўчапіліся за тое, што мера па ўвядзенні дзяржсубсідый для экспарцёраў супярэчыць прынцыпам Сусветнай гандлёвай арганізацыі, што непрымальна для Расіі, якая знаходзіцца ў вырашальнай стадыі па далучэнні да СГА, адзначыла крыніца.

Такім чынам, беларусаў развярнулі, хаця такога ў Мінску ніхто не чакаў. Па некаторай інфармацыі, цяпер Мінфін Беларусі рыхтуе новую, больш пераканаўчую матывацыю для атрымання расійскага крэдыту, якая не павінна супярэчыць правілам СГА і прынцыпам міжнароднага гандлю.

Алег СНОЎ.

ЦЭНЫ

Машына на газе? Раскрывай кашалек!

Кошт прыроднага газу для запраўкі аўтамабіляў павялічаны. Згодна з пастановай Міністэрства эканомікі ад 30 сакавіка 2007 года, гэтае паліва прадпрыемства "Белтрансгаз" будзе адпускаць спажыўцам па цане ў 685 рублёў за кубічны метр без уліку падатку на дабаўленую вартасць.

Кошт на прыродны газ для запраўкі транспартных сродкаў павялічваўся неаднаразова. Згодна з пастановай Міністэрства эканомікі ад 9 снежня 2005 года, быў вызначаны кошт газу ў памеры 602 рублі за кубічны метр без уліку ПДВ.

Нагадаем, што да апошняга павелічэння кошту гэтага паліва на сталічных аўтамабільных запраўках кубічны метр газу з улікам усіх "надбавак" каштаваў 750 рублёў. Нягледзячы на тое, што трэба будзе плаціць больш, газ у параўнанні з бензінам і дызпалівам застаецца самым выгадным відам паліва.

Ул.інф.

І ТАК БЫВАЕ

Часам яны вяртаюцца

Зніклую мемарыяльную дошку вярнулі ў амбасаду Германіі. Пра гэта паведамляецца ў спецыяльным прэс-рэлізе, які распаўсюдзіла амбасада.

Памятны знак аб тым, што брэменскія яўрэі былі падчас вайны знішчаны ў Мінску, з 1997 года знаходзіўся на жылым доме па вуліцы Гарадскі вал. Але сёлета 10 сакавіка ён таямніча знік. Пасол Германіі нават абвясціў грашовую ўзнагароду таму, хто яго верне.

Як паведамляецца, памятную дошку перадаў у амбасаду грамадзянін Беларусі, прозвішча якога не называюць. Нічога не гаворыцца і пра грашовую ўзнагароду, якую амбасада паабяцала таму, хто верне памятную дошку.

Лілія ВОРАНАВА.

Татьяну Северинец увольняют с работы

Учительницу высшей категории с 36-летним стажем Татьяну Евгеньевну Северинец — мать политзаключенного Павла Северинца — увольняют с работы. Она на протяжении многих последних лет в средней школе №40 преподавала русский язык и литературу. Кстати, Т.Северинец начала свою педагогическую деятельность пионервожатой в 16 лет. С тех пор со школой не расстается.

Начальник Первомайского районного отдела образования Владимир Шлома отдал распоряжение отделу кадров готовить документы на увольнение Татьяны Северинец.

Как пояснила Т.Северинец, в конце марта во время школьных каникул она собиралась уехать к дочке в Минск и на несколько дней в Варшаву для участия в семинаре "Дети в системе образования", организованном Варшавским центром школьной работы. Учительница написала заявление с просьбой отпустить ее в отпуск за свой счет по семейным обстоятельствам с 26 по 31 марта.

Директор школы Юрий Лавренов (к слову, аксакал витебской демократии, одно время даже возглавлял Витебское отделение БХК по защите прав человека) подписал заявление. Но, по словам самого Юрия Александровича, необходимо было свою резолюцию согласовать с "шефом". Владимир Шлома несколько дней не принимал решения. Когда же Татьяна Северинец позвонила ему, то Шлома пообещал удовлетворить просьбу. Однако, как потом выяснилось, слов своих не сдержал.

Вернувшись из отпуска, Т.Северинец узнала, что все ее уроки сняты с расписания, а ее вместе с директором школы Шлома вызывает "на ковер", требуя письменного объяснения: дескать, куда и с каким визитом ездила? Женщина тут же изложила на бумаге суть дела: *"Настоящим сообщаю, что в период весенних школьных каникул с 26 по 31 марта с письменного согласия директора школы Лавренова и устного вашего разрешения находилась в отпуске за свой счет по семейным обстоятельствам. Помогала дочери в Минске присмотреть за внучками 3 и 6 лет (живут в общежитии), а также навещала могилу дедушки в Варшаве. Заодно посетила курсы повышения педмастерства в системе образования, в соответствии с требованиями постановления Совмина Республики Беларусь №236 от 24 февраля, изданного во исполнение Указа президента Республики Беларусь А.Лукашенко №68 от 1 февраля 2007 года. Обращаю ваше внимание на то, что своим отсутствием не нанесла ущерба ни учебному процессу, ни авторитету школы, ни репутации отдела образования, ни интересам государства".*

Как сказала Т.Северинец, пытался и Лавренов высказать свое мнение: "Одна из лучших педагогов в школе, антигосударственной агитации не ведет". Но убедить непосредственного начальника не смог.

Хотя всем известно, что Т.Северинец с 2000 года участвует в избирательных кампаниях в разных качествах. И, как утверждает педагог, во время последней беседы Шлома сказал: "Кончай заниматься политикой, и все будет нормально, потому что меня из-за вас клюют".

Казалось бы, все ясно, однако уважаемой учительнице готовят "белый билет". Заметьте, за всю трудовую деятельность Татьяны Северинец кроме благодарностей никаких нареканий не было. Слава Богу, что не отправляют к сыну "пилить тайгу". Откровенно говоря, Татьяна Северинец пострадала из-за каких-то интриг, которые не украшают систему школьного образования.

И еще. Неужели в Витебске избыток учителей высшей категории?! Чтобы вот так беспардонно лишать их работы... Навряд ли тот же Шлома сможет заменить Северинец.

Владимир ЖИГУЛОВ.

P.S. *Не так давно мне приходилось разбираться с жалобой, когда в одной из школ Первомайского района с ведома директора был жестоко избит милиционером ученик-подросток. Парню даже "скорую" вызывали. Тогда директора школы с работы не уволили за антипедагогику, а вот Татьяну Северинец лишают любимого дела, можно сказать, по надуманным причинам, хотя до пенсии ей осталось всего два года. Это удар, как говорится под дых. И кому это в радость, можно только догадываться. Естественно, суд "прогульщицу" восстановит на прежнее место работы. Если, конечно, Фемида не окажется слепоглухонемой.*

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 КРАСАВІКА 2007 г.

СЛЫШАЛИ?

Белорусская калийная компания заняла лидирующее положение в мировом экспорте продукции

Белорусская калийная компания по итогам работы в 2006 году обеспечила 39% мирового экспорта калийных удобрений. Таким образом, БКК заняла лидирующее положение среди компаний, занимающихся продажами данного вида продукции. Об этом Александра Лукашенко проинформировал председатель Наблюдательного совета ЗАО "Белорусская калийная компания" Дмитрий Рыболовлев.

По его словам, специалисты "Уралкалия", ранее работавшие в Швейцарии в сфере продаж калийных удобрений, переехали в Беларусь. Теперь они будут работать в Минске.

Созданное менее двух лет назад ЗАО "Белорусская калийная компания" активно формирует свою товаропроводящую сеть. За это время открыто четыре зарубежных представительства: в Китае, Сингапуре, Индии и Бразилии. Предполагается в скором времени открыть представительство в США. Компания вышла на прямые поставки удобрений потребителям в странах Балтии, Западной и Центральной Европы, Южной Америки, Юго-Восточной Азии, Латинской Америки. География поставок постоянно расширяется.

Через БКК в 2006 году реализовано около 6,6 млн тонн калийных удобрений белорусского производства на сумму более 1 млрд долларов США. В планах на этот год увеличить продажи до 7,2 млн тонн калия, добываемого в Беларуси. А с учетом российских калийных удобрений общий объем продаж компании в 2007 году может достигнуть рекордной цифры в 11,7 млн тонн. Эта информация содержится на сайте президента.

НА ТЕМУ ДНЯ

Инвесторы, ау!..

В последние месяцы в стране активно заговорили о привлечении иностранных инвесторов. Раньше както не проявляли к ним такого интереса. Говорили о белорусской модели экономического развития как о европейском чуде. Но стоило России поднять цены на газ и нефть, как от нашего экономического чуда почти ничего не осталось. Нужны деньги, много денег. Вот и вспомнили о богатых западных инвесторах.

Эти вопросы обсуждены на заседаниях правительства и Консультативного Совета по иностранным инвестициям при Совете министров. Что показало, как говорится, "вскрытие проблемы"?

Где же «пряник»?

Правительство обсудило комплексный план мероприятий по привлечению иностранных инвестиций в экономику Беларуси в 2007 году. В чем его суть?

Премьер-министр Беларуси Сергей Сидорский настаивал на принятии напряженных планов по привлечению инвестиций. Обосновывая свои требования, руководитель правительства подчеркнул, "что это необходимо для ускорения модернизации производств". "Как бы трудно ни было, мы должны ставить перед собой эту амбициозную задачу по максимальному привлечению инвестиций, в том числе иностранных. Иначе не будет результата", — убежден Сергей Сидорский.

И он абсолютно прав. Почти все государства выходили из тяжелого экономического состояния и делали рывок вперед, лишь опираясь на крупные зарубежные инвестиции. Так что этим уже давно следовало заняться. Хорошо, что хотя бы появилось понимание.

Данный документ представил на заседании Президиума Совета министров министр экономики Николай Зайченко. На сайте Совмина сказано, что комплексный план состоит из 57 пунктов. В него включен перечень документов, которые имеют экономический, организационно-информационный и законодательный характер.

Николай Зайченко назвал наиболее важные документы, которые предусмотрено в кратчайшие сроки подготовить, чтобы активизировать работу по привлечению иностранных инвестиций. В частности, готовится проект указа Президента об освобождении от НДС и таможенных платежей технологического оборудования, комплектующих и запасных частей, ввозимых на территорию Беларуси в качестве вклада в уставный фонд. Этот документ восстановит нормы, которые действовали ранее, отметил министр.

Подготовлен также проект указа Президента о мерах по привлечению иностранных кредитных ресурсов. Предусмотрена разработка программы развития свободных экономических зон. В перечень мероприятий комплексного плана входит также проект указа Президента об изъятии земельных участков для размещения объектов инвестиционной деятельности. Этот важный документ уже практически готов, сказал министр.

Вместе с тем, подчеркнул министр, по ряду разделов комплексного плана есть замечания от республиканских органов управления. Он также сообщил, что остается открытым вопрос о приведении в соответствие с международными стандартами права государства на "золотую акцию". "Этот вопрос надо очень и очень внимательно посмотреть. Этот пункт хотя и непростой для исполнения, но тем не менее мы его предусмотрели", — отметил он.

Читаешь такое и думаешь: а где же главное? Известно, что инвесторы идут туда, где им созданы лучшие условия. Они уже давно пришли к нашим соседям — в Польшу, Словакию, Прибалтику... Идут в Россию, в Украину. Чтобы привлечь их в Беларусь, следует создать им наиболее привлекательные условия, чем в названных странах, или хотя бы не хуже. Сделано это или нет? Ответа на этот, по существу главный, вопрос мы так и не находим ни в выступлении министра экономики Николая Зайченко, ни в других материалах, размещенных на сайте Совмина.

Чем же все-таки собирается наша страна привлекать инвесторов, какой "пряник" показывает им? Что-то не видно. Зато показала, образно говоря, "большую дулю", помешав провести оппозиции митинг в честь Дня Воли и задержав ряд активистов накануне этого мероприятия и в ходе его. Власти Беларуси то ли забыли, то ли вообще не понимают, что деньги и инвесторы любят тишину, а не грохот сапог ОМОНа.

Если власти действительно ждут крупных зарубежных инвесторов, то им в первую очередь следует прекратить стучать солдатскими сапогами и размахивать резиновыми дубинками на улицах без всякого на то повода.

Алесь ДРАБЧУК.

Деловой климат? Туманный

На заседании Консультативного совета по иностранным инвестициям при Совете министров Беларуси, в работе которого принимали участие представители более 50 зарубежных компаний и международных организаций, которые осуществляют деятельность в нашей стране, а также дипломаты, разговор шел о "белорусском прянике".

Премьер-министр Беларуси Сергей Сидорский доводил, что иностранным инвесторам, работающим в малых городах, будут предоставлены преференции на три года. А если процесс пойдет хорошо, то налоговые льготы могут быть продолжены. Он также напомнил, что в нашей стране открыто относятся к приватизации крупных промышленных предприятий, что Беларусь приветствует любого инвестора, который хочет прийти к нам работать.

"Мы каждый год медленно, но уверенно снижаем налоговую нагрузку, предпринимаем значительные шаги по упрощению налогового законодательства", — говорил премьер-министр. При этом он добавил, что, к сожалению, "все сразу упростить не получается". Он подчеркивал, что подготовлен проект постановления по совершенствованию и упрощению административных процедур. "Мы снимем чиновничьи барьеры в процессе приобретения инвесторами земли для возведения новых объектов в городах республики, — сказал Сидорский. — Вы можете там строить отели, предприятия и не ходить за чиновниками и просить их о предоставлении такой возможности.

Не обошел премьер-министр и институт "золотой акции", введенный в Беларуси и критически воспринят инвесторами. Сидорский убеждал, что "золотая акция" не препятствует работе инвесторов, потому что она применяется очень корректно, определен перечень обстоятельств, при которых она может быть введена. А министр экономики Николай Зайченко убеждал, что у нас нет ни одного случая применения "золотой акции" на предприятиях с иностранными инвестициями. "Золотая акция" применена только в 8 случаях: на четырех предприятиях республиканской формы собственности и на четырех — коммунальной.

Словом, убеждали хотя и старательно, но не убедительно, как-то по-советски — обещаний много, конкретики мало. Ну кого может убедить довод — "у нас нет ни одного случая применения "золотой акции" на предприятиях с иностранными инвестициями". Не было — это вовсе не значит, что не будет. А что значит "если процесс пойдет хорошо, то налоговые льготы могут быть продолжены"? На сколько? Какие это льготы? Или вот еще перл: "Мы снимаем чиновничьи барьеры в процессе приобретения земли для возведения объектов". Какие это барьеры, когда будут сняты, какой будет порядок приобретения земли? Ничего не ясно.

Очередной "пряник" — "предпринимаем значительные шаги по упрощению налогового законодательства", но, к сожалению, "все сразу упростить не удается". Какие это шаги? Назовите конкретно. И когда они будут приняты. Что же касается, что "не все сразу удается", так это, извините, ваши проблемы и никого они не интересуют.

Понятно, что такие "доводы" малоубедительны. Крэйг Белл, представитель группы Всемирного банка в Беларуси, сообщил "Интерфакс", что "золотая акция" противоречит интересам зарубежных инвесторов. По его словам, несмотря на начатые правительством Беларуси шаги по улучшению деловой среды, инвестиционный климат в стране остается довольно сложным. "Большое количество нормативных актов, большое количество государственных органов, которые проводят проверки, запутанная налоговая система все еще присутствуют в Беларуси", — сказал он и добавил, что правительству стоит провести комплексные административные реформы, чтобы они содействовали развитию частного бизнеса, ибо рост частного бизнеса — основное условие привлечения инвестиций.

Примерно такую же точку зрения высказал и директор территориального отдела Европейского банка развития и реконструкции по Беларуси, Молдове и Кавказу Майкл Дейви.

Почти в это же время иностранным бизнесменам предложили ответить на вопрос: "Как они оценивают инвестиционный климат в Беларуси в 2006 году?". Только 17,5% из опрошенных представителей около 380 компаний считают, что он хороший или улучшился. Пятую часть участвовавших в этом опросе (17,4%) составляли немецкие компании. Об этом сообщил "Ежедневник" и добавил, что во многом похожий опрос, только касающийся деятельности немецких фирм в странах СНГ и Восточной Европы, подготовил по итогам прошлого года Восточный комитет немецкой экономики (ВКНЭ) — неправительственная организация, которая занимается продвижением немецких товаров и инвестиций на эти рынки. К сожалению, отдельно Беларусь при его подготовке не рассматривалась. Но есть отдельные данные.

Немецкие бизнесмены, работающие в Беларуси, и сотрудники ВКНЭ признают наличие многочисленных проблем, существующих на инвестиционном поле Беларуси.

Среди государств — участников СНГ четыре страны имеют положительное сальдо в торговых отношениях с Германией. Это Россия, Казахстан, Азербайджан, у которых основу экспорта в Германию составляют энергоносители, а также Армения. Беларусь вошла по итогам прошлого года в группу стран, которые больше импортируют немецких товаров, нежели поставляют туда своих.

Немецкие эксперты отмечают, что столь существенного отрицательного сальдо в белорусско-германской торговле могло не быть, если бы не действовали антидемпинговые и квотные ограничения на ряд видов белорусских товаров: калийные удобрения, химические волокна, текстиль. К примеру, у Украины, пользующейся относительной свободой на европейском и немецком рынках текстильных изделий, одежда занимает первую позицию по объемам экспорта в Германию. По итогам 2006 года она составила 33% всего украинского экспорта на немецкий рынок...

Как видим, на инвестиционном поле еще много работы. Работы конкретной, а не пропагандистской.

Сергей ИВАНОВ.

Больш экалагічнае паліва ці «поўны абсурд»?

Сёлета ў Беларусі будзе ўведзена ў дзеянне некалькі вытворчасцяў біяэтанолу

Як паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Паўлоўскі, адзін з такіх заводаў па выпуску біяпаліва ўжо дзейнічае ў Навае льні Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Сёлета плануецца ўвесці ў дзеянне аналагічныя вытворчасці ў Бабруйску і Гродне. *"Увесь свет пераходзіць на больш экалагічнае паліва. Апрача таго, у сувязі з ростам цэн на нафту і дызельнае паліва неабходна шукаць іншыя крыніцы. Адной з такіх альтэрнатыўных крыніц для вытворчасці біяэтанолу ў нас будзе рапс"*, — сказаў В.Паўлоўскі.

Паводле яго слоў, летась у краіне было атрымана 147 тыс. тон насення рапсу, а сёлета плануецца вырабіць 200 тыс. тон насення. Да 2010 года Беларусь павінна вырабляць 600 тыс. тон насення рапсу штогод. Росту аб'ёмаў яго вытворчасці плануецца дасягнуць за кошт павелічэння пасяўных плошчаў і павелічэння ўраджайнасці гэтай культуры.

Варта зазначыць, што не ўсе эксперты аграрнага рынку аднадушныя ў меркаванні аб перспектывах вытворчасці біяпаліва. Так, старшыня савета дырэктараў расійскага падраздзялення міжнароднай аграпрамысловай і харчовай карпарацыі "Bunge" Якаў Іофе ў інтэрв'ю "РБК daily" заявіў, што эканамічна біядызель пакуль нічога сабой не ўяўляе. *"Гэта ніякая не замена традыцыйнаму паліву. Максімум, чаго можа дасягнуць, — гэта 5% біядызелю ў паліве", — дадаў ён. "Палітыкі хочуць, каб карпарацыі працавалі ў гэтым напрамку, і ствараюць спрыяльныя ўмовы, але эканамічна гэта пакуль не мае ніякага сэнсу, тым больш для Расіі"*, — сказаў Я.Іофе.

Ён таксама зазначыў, што тэма біядызелю цікавая найперш для журналістаў. *"Рапсавы алей — адзін з самых карысных алеяў для чалавека. Вырабляць з яго біядызель — гэта поўны абсурд"*, — зазначыў ён.

Аляксей АРЭШКА.

КРИМИНАЛ

Не забывайте закрывать дверь

Пенсионерка, жительница поселка Пограничный Берестовицкого района, забыла закрыть дверь своего дома. Этим воспользовалась неработающая жительница соседней деревни. Она вошла в дом, похитила 10 тысяч белорусских рублей и скрылась. После обращения в местный РОВД ее задержали.

Хотел вернуть долг

Житель города Белоозерск Березовского района пришел к своему должнику в надежде получить наконец свои деньги. Спор перерос в драку. Видимо, оттого, что должник тоже был неработающим и денег не имел. В итоге кредитор избил хозяина, да так, что тот умер в больнице. По заключению судебно-медицинской экспертизы, смерть наступила от черепно-мозговой травмы и кровоизлияния в мозг.

ПЫТАННЕ ДНЯ

Цэны на жыллё набліжаюцца да еўрапейскіх. А зарплаты?

У нашай краіне імкліва растуць цэны на жыллё. Многія сем'і з жахам назіраюць за гэтай тэндэнцыяй, разумеючы, што губляюць надзею хоць калі-небудзь узбіцца на ўласны кут. Улады спрабуюць падсаладзіць жыццё абяцаннямі пра таннае жыллё ў будучым.

Абяцанні і рэальнасць

Прымаючы з дакладам міністра архітэктуры і будаўніцтва ў чэрвені мінулага года, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў 2007 годзе неабходна забяспечыць кошт аднаго квадратнага метра не больш за 600 долараў для грамадзян, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

Разглядаючы праект бюджэта на гэты год, ён зазначыў, што цана квадратнага метра жылля павінна быць не больш за 400 долараў, што гэта "максімальная цана ў панельным доме".

Між тым СМІ паведамляюць, што цэны на жыллё пастаянна растуць. Па інфармацыі сайта realting.com, сярэдняя цана сталічнай аднапакаёвай кватэры зімой складала 58 тысяч долараў, адзін квадратны метр яе — 1670 долараў.

Калі пісаўся артыкул, кошт аднапакаёўкі ўжо ўзняўся да 68 тысяч долараў, а цана квадратнага метра ў ёй — да 1944 долараў. Улічваючы, што сярэдні заробак у краіне недзе 300 долараў у месяц, каб зарабіць на адзін квадратны метр, трэба працаваць 6,4 месяца, больш за паўгода. А каб зарабіць на аднапакаёвую кватэру, трэба ўвіхацца 19 гадоў пры ўмове, што не будзеце траціць грошы на яду і адзенне, а ўсё адкладваць толькі на кватэру.

Зазначым, што кошт аднаго квадратнага метра ў двухпакаёўцы складае 1758 долараў, у 4-пакаёвай кватэры — 1544. Выходзіць, што сярэдняя цана "квадрата" — 1700 долараў, ці 1275 еўра. СМІ пішуць, што наш кошт на жыллё ўжо наблізіўся да еўрапейскага, што ў Берліне двухпакаёвая кватэра каштуе 50 тысяч еўра.

Трэба сказаць, што параўнанне з Берлінам некарэктнае. Ва Усходнім Берліне і ў цэлым ва ўсходніх землях пустуюць сотні тысяч кватэр. Такая іх вялікая колькасць тлумачыцца нізкай якасцю. Яны пабудаваны ў былой ГДР у панельных дамах і нават па нізкай цане не знаходзяць пакупнікоў. У цэлым у Берліне кошт квадратнага метра складае 3167 еўра.

Які ж кошт квадратнага метра ў Еўропе? Ці сапраўды нашы цэны ўжо наблізіліся да еўрапейскіх?

Колькі каштуе квадратны метр у Еўропе?

Спачатку пацікавімся ў суседзяў па СНД. У Маскве квадратны метр жылля каштуе 4200 долараў. Гэта ў сярэднім, а ў цэнтры — 6—7 тысяч. У Кіеве, як паведамляе кансалтынгавая кампанія "Украінская гандлёвая гільдыя", у снежні мінулага года сярэдні кошт квадратнага метра складаў 2800 долараў. Пасля таго цэны раслі.

Самае дарагое жыллё ў Лондане. Тут "квадрат" каштуе 7,2 тысячы еўра і кватэра плошчай 120 квадратных метраў — 864 тысячы еўра. Не намнога меншыя цэны ў Парыжы, Амстэрдаме, Рыме. Масква — на шостым месцы. Па падліках кампаніі Global Property Guide, летась сярэдні кошт маскоўскага "квадрата" складаў 6260 еўра. Расійскае агенцтва, як было сказана вышэй, называе меншую лічбу.

Але давайце пазнаёмімся з данымі кампаніі Global Property Guide. Яна склала рэйтынг кошту квадратнага метра жылля ў сталіцах і вядучых гарадах Еўропы. Даныя ўзяты за мінулы год.

Горад	Цана 1 кв. метра (у еўра)
Лондан	7199
Парыж	6667
Амстэрдам	6667
Вадуц	6333
Масква	6266
Рым	6083
Цюрых	5934
Осла	5177
Дублін	5000
Жэнева	4417
Мадрыд	4000
Берн	3967
Люксембург	3934
Капенгаген	3784
Хельсінкі	3333
Мюнхен	3333
Берлін	3167
Стакгольм	3167
Вільнюс	3100
Рыга	3020
Вена	3000
Франкфурт	2917
Андора	2583
Лісабон	2517
Любляна	2467
Стамбул	2467
Талін	2383
Прага	2367
Бухарэст	2350
Загрэб	2215
Лімасол	2167
Брусель	2150
Валета	1967
Афіны	1833
Будапешт	1792
Браціслава	1292
Варшава	1175
Скоп'е	1125
Сафія	1042
Кішынёў	917
Мінск	1275

Як бачым, Мінск па цане на жыллё ўжо абскакаў Кішынёў, Сафію, Скоп'е, Варшаву і наблізіўся да Браціславы, Будапешта, Афін...

Але хіба так шпарка набліжаецца да еўрапейскага ўзроўню наша зарплата?

Колькі «квадратаў» можна купіць на іх і на нашу зарплату?

Кошт квадратнага метра жылля сам па сабе яшчэ мала што гаворыць. Яго варта разглядаць праз прызму заробкаў. Так, у Еўропе больш высокія цэны на жыллё. Але ж там і зарплаты намнога большыя. Колькі ж можна купіць квадратных метраў жылля на іх і на нашу зарплату? Давайце параўнаем.

Вось якія лічбы прыводзяць СМІ па сярэдняй зарплаце.

Краіна	Сярэдняя зарплата за год (у еўра)	Колькі кв.м жылля можна купіць у сталіцы за такія грошы
Бельгія	53.577	26
Швецыя	52.800	17
Германія	50.445	16,6
Люксембург	49.752	13
Вялікабрытанія	46.541	6,5
Польшча	9600	4,4
Беларусь	$3600	2,1

Ёсць яшчэ адзін важны паказчык дабрабыту — сярэднегадавы даход на душу насельніцтва. Які ён у нас і ў іх? Колькі квадратных метраў жылля можна купіць на іх і на наш сярэдні даход на душу насельніцтва

Краіна	Сярэднегадавы даход на душу насельніцтва (у доларах)	Колькі м. кв. жылля можна купіць на такі даход у сталіцы
Польшча	7100	5
Славенія	9760	6,9
Славакія	7950	6
Венгрыя	10.030	4,4
Эстонія	9100	3
Вялікабрытанія	37.600	4,4
Беларусь	2140	1,25

Ці патрэбны тут яшчэ каментарый? Думаецца, лічбы самі гавораць за сябе. Так, наша цана на жыллё сапраўды набліжаецца да еўрапейскай. Ва ўсякім разе яна блізка да цаны ў краінах Усходняй Еўропы. А вось заробкі беларускія і даходы моцна адстаюць.

Словам, цэны еўрапейскія, заробкі і даходы — беларускія. Пры такой сітуацыі непазбежнае пагаршэнне дабрабыту працоўных.

Алесь ДРАБЧУК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 КРАСАВІКА 2007 г.

МИТИНГОВЫЕ СТРАСТИ В СНГ

Нет, это не Беларусь. Это уже Россия

Российская милиция не позволила членам оппозиции, объединившимся в коалицию “Другая Россия”, провести марш в центре Санкт-Петербурга. Около 120 человек задержаны.

Митинг оппозиции, на проведение которого организаторы заранее получили разрешение властей, прошел спокойно: в нем приняли участие от одной до двух тысяч людей. Он начался с выступлений, в которых критиковалось строительство небоскреба “Газпрома” в Петербурге, а также снятие с выборов петербургского “Яблока”. После каждого тезиса собравшиеся скандировали “Позор!” и “Это — наш город!”. Кроме того, было выражено стремление создать объединенный Освободительный фронт.

Стычки начались уже после его окончания, когда около 500 демонстрантов двинулись в направлении Смольного, где находится кабинет губернатора Санкт-Петербурга и городская администрация.

“Другая Россия”, которая накануне провела “Марш несогласных” в Москве, планировала устроить аналогичное шествие и в Петербурге.

Однако санкции на проведение марша власти не дали. Спецподразделения плотно оцепили Пионерскую площадь, на которой проходил митинг, и постарались не выпустить его участников на другие улицы.

В числе задержанных — лидер питерских “яблочников” Максим Резник и глава городского отделения Объединенного гражданского фронта Ольга Курносова — она попала в руки милиции еще до начала акции, при выходе из дома.

По данным милиции, около 120 участников митинга оппозиции в Петербурге будут привлечены к административной ответственности.

В столкновениях с ОМОНом пострадало несколько человек — не только участники акции, но некоторые прохожие, передает наш корреспондент на месте событий. Досталось и многим журналистам.

Лица Майдана

Нынешние действия украинской “бело-голубой” коалиции почти в точности повторяют сценарий “оранжевой революции” конца 2004 года: постоянно действующий митинг на Майдане Незалежности, концерты, палаточные городки...

На митинге на Майдане и в палаточном городке у парламента немало молодых людей и девушек, по виду и лексикону которых трудно предположить, что они склонны глубоко и всесторонне обдумывать тонкости политики.

Немало их было и на “оранжевом” Майдане, но те были более разговорчивы. Сейчас при попытке задать содержательные вопросы, почти всегда получаешь примерно такой ответ: “Нельзя нам говорить... Распространять вот это вот... Нет, никто не запрещает, просто нельзя”.

Один молодой безработный приехал с востока страны, из Мариуполя. В палаточном городке живет уже вторую неделю. Заверяет, что приехал не за деньги, а добровольно, поддержать Януковича. На этом разговор окончен.

Первый секретарь Ровненского городского комитета компартии Украины подполковник запаса Александр Федоров объясняет неразговорчивость молодых соратников по коалиции падением уровня образования после развала Советского Союза.

“Наш советский троечник был на уровне студента второго курса Гарвардского университета, — уверяет Федоров. — А сейчас, извините, что им преподают в школе? Он, понимаете, хочет сказать, а ему не хватает [слов], потому что у него все компьютерные игры, интернеты... Книг-то не читают”.

“Бело-голубая” молодежь все же не вся молчалива в присутствии журналистов. У студентки пединститута Марины из города Александрия Кировоградской области мама — активистка Партии регионов. Марина твердо знает, зачем приехала, и выдает сразу целый монолог.

“В последнее время пенсии увеличились, определенные деньги начали выделяться при рождении ребенка, определенные заводы начинают возрождаться, и мы хотим, чтобы это развитие продолжалось и было все к лучшему”, — говорит она.

Отправка людской силы из Александрии, по словам Марины, налажена, как конвейер.

“У нас партией организовано, каждый день сюда выезжают четыре автобуса, четыре выезжают, четыре приезжают, в каждом автобусе — лидер, на каждом предприятии проходят собрания и запись, мы организованно собираемся и едем”, — говорит она.

Молодежи на митинге много, но не большинство. Пожилые же участники, как, например, беспартийная киевлянка Тамара Антонюк, твердо знают, зачем пришли. “Я пришла отстоять свою конституцию. Чтобы все в нашем государстве выполняли эту конституцию, в том числе и президент”, — говорит Антонюк.

Заодно она нарисовала, принесла и развернула плакат со словами “НАТО — нет”.

А еще одну большую часть присутствующих на любом митинге всегда составляют случайные зеваки. Такие, например, как киевский студент Виталик с друзьями. “Я к друзьям приехал. Просто сижу здесь, отдыхаю, с друзьями общаюсь”, — объясняет Виталик. Друзья тоже не митингуют, просто Майдан — обычное место их посиделок.

На участников митинга Виталий смотрит крайне скептически.

“Маразм полный. Если бы кто-то здесь стоял за идею, то да, я бы был согласен. А так — просто стоят. За деньги или просто так”, — уверен студент.

И на “оранжевом” Майдане Виталик тоже просто пил с друзьями пиво. И на выборы он не пойдет. “Нет смысла, — говорит. — Ничего же не изменится”.

Юрий МАЛОВЕРЬЯН.

Киев.

“Ребята, мы не те флаги развернули!” — кричал на киевской площади Леси Украинки, под зданием Центризбиркома, студент Сергей, старший группы профессиональных митингующих. Походы на митинги стали для них бизнесом. Сергей говорит, что у него все схвачено: транспорт арендован, контингент подобран и поделен на три смены. “Выезжаем на место события по заказу любой партии. Нас политика не волнует”.

Митинги стали для студентов приработком, для донбасских шахтеров — средством выживания. За неделю ночевок на Майдане Незалежности, у стен Верховной рады и под Центризбиркомом они зарабатывают столько, сколько в забое за две. “Но тут мы по Киеву гуляем. На экскурсии ездим, горилку в палатках пьем, под гитару поем. Это ж отдых, а не труд”, — просвещает парень молодой, вышедший в Киев из степи донецкой.

За день “работы” на киевских митингах приезжие из регионов получают по 50 гривен (примерно 10 долларов). Труд киевлян стоит дороже — 70 гривен.

Главное занятие митингующих — пешие походы по Киеву. Колонны движутся от Центризбиркома, где разбит сине-оранжевый палаточный городок, от Верховной рады, где ночуют “синие”, и от кабинета министров, где обосновались “оранжевые”.

Точек назначения тоже три — президентский секретариат, Майдан Незалежности, Европейская площадь. У тех, кто живет в палатках, и у тех, кто ночует в автобусах под Киево-Печерской лаврой, расписание одно: подъем в 7 утра, в 7.30 — прыжки в спальных мешках с целью согрева, в 8.00 — чай и каша из полевых кухонь, в 8.30 — начало марша.

Всем, кто идет в колоннах, раздали типовую униформу — плащи, похожие на мушкетерские. У “регионалов” они синие, у сторонников Ющенко — оранжевые, у социалистов — малиновые, у коммунистов — алые.

Izvestia.ru

Это очень важная школа, которую мы должны пройти сами

Что происходит в Кыргызстане?

Киргизская оппозиция продолжает митинги на улицах Кыргызстана, требуя отставки президента. Глава государства Курманбек Бакиев обратился к гражданам страны с призывом сохранять спокойствие и не поддаваться на провокации. Своим мнением о ситуации в Кыргызстане поделился в интервью Русской службе “Голоса Америки” лидер Коалиции за демократию и гражданское общество Эдиль Байсалов.

Наджия Бадыкова: — Что все-таки происходит в Кыргызстане? Есть ли аналогия с тем, что происходит в Украине?

Эдиль Байсалов: — На самом деле, если присмотреться, то речь идет о прямо противоположных требованиях площадей. Потому что в Украине — там как раз таки кризис парламентской модели власти. А у нас — наоборот, требования эту парламентскую власть ввести. Ну, а в целом, конечно, благодаря демократическим реальным преобразованиям, которые имели место как в Украине, так и в Кыргызстане, есть пространство, есть возможность для таких митинговых страстей. Это реальное отличие нас от наших соседей по СНГ.

Н.Б.: — Почему развалился тандем между Феликсом Куловым и Курманбеком Бакиевым?

Э.Б.: — Наши надежды на Феликса Кулова, что он будет балансировать и выступать каким-то противовесом авторитарным амбициям Курманбека Бакиева, не оправдались. Феликс Кулов растерял кредит доверия, который у него реально был. Именно поэтому Кулов не смог стать противовесом, не смог стать голосом того демократического лагеря, который он претендует сейчас возглавлять и представлять.

Н.Б.: — Какова реакция России на процессы, которые происходят в Кыргызстане?

Э.Б.: — Российское правительство не теряет возможности еще раз сказать: вот, дестабилизация, вот что значит “цветная революция”. Но я думаю, что наши друзья в России понимают, что в Кыргызстане происходят какие-то события. Возможно, они действительно имеют большую опасность для дестабилизации, и эта опасность есть, но в любом случае я знаю очень многих людей в России, в Москве, даже депутатов Госдумы, которые говорят, что в Кыргызстане и в Украине, в других странах есть реальная политика , где народ имеет возможность влиять на то, что происходит в коридорах власти. А за всей этой истерикой, которая пробивается, выливается на страницы печати, я иногда вижу настоящую зависть.

Н.Б.: — Чем в сложившейся ситуации вам могут помочь США?

Э.Б.: — Нам, безусловно, очень важно, чтобы и страны Запада, и наши партнеры по СНГ внимательно и детально отслеживали ситуацию, для того чтобы понять все нюансы наших внутриполитических процессов. Нам, безусловно, нужно, чтобы ни одна страна не вмешивалась в наш процесс. Это очень важная школа демократии. Это очень важная школа, которую мы должны пройти сами. Эти уроки мы должны выучить и пройти сами. Возможно, мы набьем несколько шишек, но, конечно же, самая важная роль, которую должны сыграть наши внешнеполитические партнеры, — это призывать всех участников процесса воздерживаться от насилия и придерживаться только законных конституционных и демократических методов в своей борьбе.

Посол Кыргызстана в США Замира Садыкова в своем эксклюзивном интервью Русской службе “Голоса Америки”, посвященном ситуации в стране, отметила, что причины происходящего корнями уходят во времена правления президента Акаева, когда в результате внесения изменений в Конституцию произошла на самом деле узурпация власти президентом, что стало детонатором “тюльпановой революции” 2005 года.

“Когда произошла революция, — отметила Замира Садыкова, — были необходимы конституционные реформы, которые бы сбалансировали ветви власти и поставили все на свои места. Однако процесс этот очень сложный. Конституция — это основной закон страны, но у каждой из политических групп, которые накануне революции были вместе, а потом разъединились, есть свой подход и свое видение государственного устройства страны и того баланса ветвей власти, которые необходимо соблюсти. Уже прошло два года после революции, но, к сожалению, политические силы не могут договориться между собой.

Все это и вызывает протестные акции, когда протест становится либо последним аргументом, либо ультиматумом той или иной политической группы в отстаивании своего мнения, своего варианта Конституции, своего видения государственного устройства страны. Пока все политические силы не осознают, что пора остановиться и сесть за стол переговоров и, быть может, все-таки начать вместе работать постатейно над Конституцией, до тех пор все это будет провоцировать волнообразные протестные акции. Я вижу, что в Украине происходит то же самое".

СЛЫШАЛИ?

Грандиозный мегаконцерт Альберта Гора

Сто музыкальных ансамблей, семь городов на пяти континентах, 24 часа музыки, 2 миллиарда зрителей.

В Лондоне на полностью обновленном стадионе “Уэмбли” выступит Мадонна, Duran Duran, Red Hot Chili Peppers, Genesis. В Америке, в Нью-Джерси, выступят Police, Бон Джови, Кейни Уэст. Другие звезды появятся в Рио-де-Жанейро, на пляже в Копакабане, в Шанхае, на Токийском стадионе, в Сиднее, в Южной Африке...

Это событие в прямом эфире будут показывать телеканалы по всему миру, концерты прозвучат по радио, будут передаваться по Интернету. Билет на концерт в “Уэмбли” стоит приблизительно 75 евро.

Бывший американский вице-президент Альберт Гор стал промоутером во имя благой цели: выступить против загрязнения, убивающего Землю. Получивший “Оскар” за свой документальный фильм о последствиях глобального потепления, бывшая правая рука Клинтона решил организовать первый “зеленый” концерт в истории. Гор также объявил, что при проведении мероприятия будет использоваться только чистая энергия, что напитки и еда будут расфасованы в биоразлагающиеся контейнеры, что все отходы будут переработаны, что сами авто, которые будут использоваться для доставки звезд на концертные площадки, будут работать на “зеленой” энергии.

В самом классическом американском стиле мега-концерт 7 июля должен удивить своей грандиозностью: в амбициозные планы Альберта Гора входит привлечение в качестве публики более 2 млрд человек, и по этой причине в 24-часовом музыкальном шоу нон-стоп примут участие артисты, представляющие самые разные музыкальные направления, от рока до попа: молодые дарования и величайшие звезды, способные привлечь публику самого разного возраста и музыкальных пристрастий. “Этой публике, — сказал Гор, — мы хотим направить послание: необходимо спасать Землю, мы должны стать критической массой, которая будет давить на политику, чтобы добиться достижения этой цели. На кону — наше общее будущее”.

В ожирении виноваты бактерии

Исследователи обнаружили, что соотношение микроорганизмов в кишечнике людей, страдающих ожирением, не такое, как у людей здоровых. Джеффри Гордон и его коллеги из Медицинской школы Вашингтонского университета показали, что есть микроорганизмы, создающие предрасположенность к ожирению, и они поглощают больше калорий из пищи, которые потом откладываются в виде излишков жира.

Более 90% микроорганизмов обитающих в кишечнике это — Bacteroidetes (условно B) и Firmicutes (условно F). Исследователи взяли бактерии из кишечника худых и полных мышей, и пересадили их в кишечник мышей, искусственно лишенных микрофлоры. Через две недели мыши, которым были пересажены “микробы ожирения” — F, набрали примерно в два раза больше жира, чем те, которым были пересажены “микробы стройности” — B.

Анализы, взятые у людей-добровольцев, подтвердили результаты, полученные на животных. Сравнив анализы добровольцев, страдающих ожирением, с анализами стройных, оказалось, что у полных людей было больше “микробов ожирения” — F и намного меньше “микробов стройности” — B. Возможно, ученым удастся выделить действующие вещества этих бактерий, чтобы с их помощью лечить ожирение.

ВОПРОС ДНЯ

Всегда ли экономический рост является благой целью?

На днях межправительственная комиссия ООН по вопросам изменения климата представила вторую часть своего доклада о грядущих переменах климата. Описанная в докладе картина заставляет задуматься о конце света: моря и океаны наступают на сушу, люди бегут с побережий в центры континентов; бури и засухи на корню уничтожают урожай на полях; люди падают замертво от невыносимой жары.

В мире еще не утихла дискуссия, вызванная первой частью доклада, появившейся в начале февраля прошлого года. В ней ученые развеяли последние сомнения в том, что “парниковый эффект” — это объективная реальность. Назван и виновник: жизнедеятельность человека. И вот теперь во второй части описаны возможные последствия глобального потепления климата: периоды жары и засухи, наводнения, бури, лесные пожары. Авторы доклада подчеркивают, что, даже если сейчас изменить курс всей политики защиты среды обитания, это может лишь смягчить последствия, но не отвратить их. И все эти мрачные предсказания прозвучали в Страстную неделю.

Самое интересное, что ничего принципиально нового в докладе не содержится. Новое — это широкий общественный интерес к теме. Самое позднее в июне этого года, на встрече Большой восьмерки в Германии выяснится, готовы ли политики извлечь конкретные уроки из выводов комиссии.

Первое требование — резкое сокращение выброса в атмосферу парниковых газов. Германия считает себя пионером в области охраны окружающей среды. Но сейчас страна поставлена перед выбором: если действительно отключить все атомные электростанции, как это предусмотрено соглашением между правящими партиями, то Германия не достигнет намеченного сокращения эмиссий углекислого газа. Конечно, атомную энергетику нельзя считать экологически чистой, но хотя бы на климат она не влияет. Остается вопрос захоронения радиоактивных отходов. Но ввиду необходимости принять экстренные меры против изменения климата даже эта проблема отступает на задний план.

Такие источники энергии, как солнце, ветер, вода, — все должно быть использовано. В Германии эти источники обеспечивают значительную долю энергопотребления. И тем не менее выбросы углекислого газа в прошлом году повысились просто потому, что начался долгожданный экономический подъем.

И вот тут мы подошли к главному. Все попытки сдержать потепление климата до сих пор сводятся к более рациональному использованию энергии и новым технологиям. Но никто не решается задать вопрос: а является ли экономический рост благой целью? Конечно, было бы наивно пытаться уговорить Китай, Индию и другие развивающиеся страны отказаться от надежды повысить жизненный уровень своего населения. Но и в самых богатых странах мира никто не берется определить границы экономического роста. “Тот, кто верит в возможность безграничного роста в ограниченном мире, либо сумасшедший, либо экономист”, — сказал как-то Кеннет Боулдинг. Правда, он и сам был экономистом. Однако именно против этого сумасшествия и был направлен изданный в 1972 году доклад “Римского клуба”. Название доклада сегодня актуально как никогда: “Пределы роста”. С тех пор прошло 35 лет. И ничего не изменилось, кроме климата.

Андреас БЕККЕР, обозреватель “Немецкой волны”.

ФОТОВЗГЛЯД

Старейшина афганской деревни ведет женщин и детей на бесплатный медицинский осмотр, организованный армией США.

“Зеленые” во Франции предлагают всем пересесть на велосипеды.

Пришили откушенную крокодилом руку

Тайваньские хирурги успешно пришили человеку руку, откушенную крокодилом, сообщает Центральное новостное агентство Тайваня.

Инцидент произошел в зоопарке города Гаосюн на юге острова. Ветеринар Чжан Боюй собирался провести осмотр крокодила, который последнюю неделю вел себя крайне вяло. Однако когда ветеринар подошел близко к нему, животное неожиданно напало на доктора и откусило ему руку.

Откусив руку, крокодил плотно сжал челюсти. Он открыл пасть только после того, как полицейские дважды выстрелили в него из пистолетов, сообщают тайваньские СМИ.

Фотография крокодила с откушенной рукой в пасти появилась в большинстве тайваньских газет, что было расценено некоторыми депутатами местного Законодательного собрания как нарушение журналистской этики.

По словам врачей, Чжану потребуется по меньшей мере несколько лет на восстановление хотя бы 80% работоспособности пришитой руки.

ПОУЧИТЕЛЬНАЯ ИСТОРИЯ

Как умирало море

Над морем встает солнце. Местный рыбак Алик вытаскивает из воды полную сеть с карпами, осетрами, камбалой.

Два года назад он и мечтать не мог о таком улове.

“Все это стало возможным благодаря плотине”, — говорит Алик, выворачивая сеть на растущую гору рыбы на дне лодки.

Плотина, о которой идет речь, была построена в рамках проекта казахского правительства и обошлась в 68 млн долларов. Финансировалось строительство за счет кредита Всемирного банка.

Многие думали, что Аральское море погибло навсегда. Этот амбициозный проект был призван вернуть его к жизни и ликвидировать последствия одной из самых серьезных экологических катастроф, вызванных человеком.

“Аральское море не погибло, Аральское море убили”, — говорит Нажмадин Мусабаев, глава Аральского района Кзылординской области.

Он помнит, как в конце 1960-х годов советское правительство провело пленарное заседание в столице Узбекистана Ташкенте. На этом заседании замминистра по ирригации и водным ресурсам СССР говорил о планах правительства повысить производство хлопка в регионе. “Русла двух главных центральноазиатских рек — Амударьи и Сырдарьи, — сказал он, — будут изменены, чтобы обеспечить ирригацию хлопковых полей в Казахстане и Узбекистане”.

“А что будет с Аралом?” — выкрикнул кто-то из зала.

“Арал, — ответил заместитель министра, — должен будет красиво умереть”.

Но смерть моря не была красивой.

По мере его отступления от берегов началось наступление пустыни. Это привело к изменению климата и разрушило экосистему. Некоторые виды растений и животных исчезли, а тысячи людей были вынуждены покинуть родные места.

С каждым годом рыбакам приходилось уходить все дальше, а их уловы становились все более скудными. Опустынивание и повышение концентрации соли в морской воде привели к солевым бурям. Среди местного населения все чаще стали встречаться такие болезни, как анемия и рак.

К 1990-м годам от Аральского моря, некогда бывшего четвертым в мире по величине внутренним озером, осталась лишь четверть его прежней площади.

Сегодня город Джамбул — некогда процветающий рыбацкий центр — стоит посреди пустыни. Вокруг него разбросаны остовы ржавеющих кораблей. Рядом с ними верблюды щиплют бесцветную сухую траву, пробивающуюся сквозь серый песок.

Джамбульский рыбак Джалказбай помнит время, когда все было иначе. “В детстве я ходил рыбачить вместе с отцом и братьями, а мои дети выросли без моря”, — говорит Джалказбай.

“Но я надеюсь, что у моих внуков будет шанс стать рыбаками”, — добавил он.

В шести часах езды на машине от Джамбула находится плотина, которая дала Джалказбаю надежду. Построенная недавно 13-километровая плотина разделила Аральское море на две части.

Конечно, целиком проблему она не решит. В своей южной части, у границ Узбекистана, море продолжает отходить.

В Казахстане плотина обеспечила подпитку северной части Арала, и в результате вода стала возвращаться. По словам казахских чиновников, море здесь восстановилось уже на 40%. Рыбаки снова занялись промыслом. В этом районе снова стали выпадать осадки.

С помощью нового кредита в 126 млн долларов от Всемирного банка казахское правительство планирует построить вторую плотину. Власти надеются, что она поможет подвести море к портовому городу Аральску. Сейчас это мрачный и обветшалый провинциальный город, а в прошлом был самым крупным портом на всем аральском побережье.

Море сейчас находится по меньшей мере в 40 км от гавани, но в ходе второй стадии проекта по спасению Арала, — утверждает правительство, — к 2010 году оно подойдет к Аральску. В городе все с нетерпением ждут этого момента.

Наталья АНТЕЛАВА.
Би-Би-Си, Казахстан.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 КРАСАВІКА 2007 г.

ВЕРСІЯ

Беларускі лёс Арыны Радзівонаўны

Нядаўна, як паведаміла “Народная воля”, у Кобрыне распачалося будаўніцтва храма-помніка ў гонар расійскага палкаводца Аляксандра Суворава. Хто такі Суораў для Беларусі? Пад яго кіраўніцтвам тут з надзвычайнай жорсткасцю падаўляліся вызвольныя паўстанні канца XVIII стагоддзя, тварыліся цяжкія злачынствы супраць мірных насельнікаў, нашых продкаў. Менавіта Суораў на штыках прынёс у Беларусь прыгоннае права. Паказальна, што руская праваслаўная царква тады бласлаўляла на “подвиги” імперскага генералісімуса, а сёння яна падтрымлівае акцыю ўслаўлення карніка беларускага народа.

Якія страты цярпела і церпіць наша Бацькаўшчына ад дзеянняў расійскіх імперцаў цягам стагоддзяў, можна бачыць на лёсе аднаго чалавека, чыё паходжанне звязана з Беларуссю і ў прыватнасці — з тым самым нашым Кобрынам, дзе сёння імкнуцца ўшанаваць памяць не ахвяр-землякоў, а карнікаў і катаў. Імя гэтага чалавека ведае без сумневу кожны школьнік і дарослы. Гэта — Арына Радзівонаўна Якаўлева, нянька Аляксандра Пушкіна...

Арына Радзівонаўна, няня Пушкіна (Барэльеф работы Я.Серакова).

Калі параўноўваць лёс Арыны Радзівонаўны з лёсам Беларусі, яны, лёсы гэтыя, — вельмі падобныя сваёй трагічнасцю, якую склалі шчодрасць душы, вялікі мастацкі талент і рабскае становішча ў свеце.

Мала хто ведае, што нянька Пушкіна сама мела чатырох дзяцей ад мужа Хведара Мацвеева, па нацыянальнасці карэла (памёр у 1798 годзе): Ягора (нарадзіўся ў 1782 годзе), Надзею (1788), Марыю (1789), Стэфана (1798). Калі яна карміла сваіх дзяцей, ёй у абавязак было пастаўлена ўласнымі грудзьмі выкарміць і панскіх — Вольгу і Аляксандра. Апроч гэтых дваіх яна карміла яшчэ некаторых з пяцярых дзяцей Пушкіных (яны ў маленстве памерлі). Самага малодшага, Льва, толькі даглядала. Паміралі дзеці і ў яе; тады карміла толькі панічоў. Больш за тое — Арына Радзівонаўна выкарміла яшчэ некалькі малых — гаспадаровых сваякоў. Пры кармленні была чарга: спачатку ішлі панскія дзеці, а ўжо потым свае. Неабходна заўважыць, што бацькі паэта, як, відаць, і большасць людзей гэтага асяроддзя, мала займаліся сваімі дзецьмі, перадаручаючы іх нянькам і гувернёрам.

Паводле кодэксу маралі тых часоў, прыгонныя такога “рангу”, як нянька, мелі вельмі абмежаваную мажлівасць выхоўваць сваіх уласных дзяцей, не гаворачы ўжо пра ўнукаў. Бацькі і дзеці былі на працягу амаль усяго жыцця ў разлуцы. І часта любоў да ўласных дзяцей у прыгонных знаходзіла выйсце ў любові да панічоў.

...Уважліва ўчытайцеся ў верш Пушкіна “Няне” — і вы адчуеце стан самотнай чалавечай душы. Ці не таму Арына Радзівонаўна часам зазірала ў кілішак? Нас зачароўвае прыгажосць пушкінскага верша “Зимний вечер”, але колькі там тугі і нязбыўнага душэўнага болю!

...Летам 1828-га сямідзесяцігадовая Арына Радзівонаўна пераехала з Міхайлаўскага ў Пецярбург да Вольгі Сяргееўны Паўлішчавай (Пушкінай) і ў тым жа годзе памерла. Дзе яе пахавалі, ніхто не ведае і па сёння. Адны сцвярджаюць, што на Смаленскім могільніку, другія — на Мала-Охцінскім у Пецярбургу, трэція — у сяле Міхайлаўскім.

Сам Пушкін жыў пасля смерці сваёй нянькі яшчэ дзесяць гадоў, але, відаць, і ён не наведваў сумны ўзгорак. Іначай сябра Пушкіна паэт М.Языкаў у 1830 годзе ў вершы “На смерть няни Пушкина” не пісаў бы: “Я отыщу тот крест смиренный...” Тут жа Языкаў гаворыць і пра ўплыў Арыны Радзівонаўны не толькі на Пушкіна, але і на паэтаў яго асяроддзя.

Чым жа вытлумачыць такія адносіны да жанчыны, якая адыграла выключную ролю ў фарміраванні дзіцячых уражанняў паэтычнага генія Расіі, якую Пушкін, па словах роднай сястры паэта, палюбіў з дзяцінства і чый унікальны дар ацаніў, калі жыў на выгнанні ў Міхайлаўскім? Ад Арыны Радзівонаўны захаваліся ў запісе паэта сем казак і дзесяць песень. Казкі пра цара Салтана, пра папа і яго работніка Балду таксама сышлі з вуснаў самай, пэўна, знакамітай нянькі ў свеце. Сюжэты некаторых казак Арыны Радзівонаўны паэт падараваў сваім сябрам, напрыклад, пра цара Берандзея — Васілю Жукоўскаму. Па сведчаннях той жа сястры Пушкіна Вольгі Сяргееўны, нянька па-майстэрску расказвала казкі, ведала некаторыя павер’і, сыпала прыказкамі і прымаўкамі. Натуральна, што ў яе будучы паэт вучыўся прыгажосці і вобразнасці мовы.

З імем Арыны Радзівонаўны звязаны творы паэта “Ах, умолчу ль о мамушке...”, “Сон”, “Вновь я посетил...”. Шырокую вядомасць яе імя набывае пасля таго, як у 1828 годзе выходзіць у свет трэці раздзел “Евгения Онегина”, і аўтар не ўтойвае, што Арына Радзівонаўна — “оригинал няни Татьяны”. Гэта ж тычыцца і вобраза нянькі Уладзіміра Дуброўскага — Арыны Базыравай, а таксама “мамушки” царэўны Ксеніі ў “Борисе Годунове”. Дарэчы, “Дубровский”, як вядома, напісаны на беларускім матэрыяле.

І вось... ніхто з сяброў Пушкіна не ведае, дзе, на знак памяці той, што абагрэла і ўзбагаціла сваёй душою і іх, пакласці на магілу кветкі. Не засталося і прыжыццёвага партрэта Арыны Радзівонаўны. А тады ж было модным замаўляць партрэты — і свае, і сваіх блізкіх.



У сяле Міхайлаўскім на Пскоўшчыне, дзе цяпер Пушкінскі запаведнік, захаваўся дамок Арыны Радзівонаўны...

Што гэта? Звычайная няўважлівасць? А можа, прычынай рабскі клімат у тагачасным расійскім грамадстве? І таму атрымалася: літаратура — сама па сабе, а жывое жыццё — само па сабе?

А цяпер паглядзім на тыя абставіны, што могуць у нейкай ступені сведчыць аб беларускім паходжанні нянькі Пушкіна. У некаторых гістарычных і літаратурных крыніцах паведамляецца, што сваім нараджэннем Арына Радзівонаўна Якаўлева, у замужжы — Мацвеева (1758—1828) звязана з *Кобрынам.*

Адразу прыходзіць думка: ці не з тым, што пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай быў уключаны ў склад Расіі і які ўказам Кацярыны II ад 15 жніўня 1795 года падараваны ў вечнае і спадчыннае валоданне генерал-фельдмаршалу графу Аляксандру Суораву-Рымнікскаму за задушэнне нацыянальна-вызваленчага паўстання Тадэвуша Касцюшкі і ўдзел у акупацыі суседняй дзяржавы? Ці не з тым Кобрынам, што пад Брэстам? А мо — з сялом Кобрынам, што паблізу Гатчыны пад Пецярбургам? Аказваецца — і з тым, і з другім. Дакладней, з другім, які вядзе сваю генеалогію ад першага...

У час сваіх захопніцкіх рэйдаў на нашу зямлю царскія войскі вельмі часта гналі ў маскоўскае рабства палонных ліцвінаў (беларусаў). Адначасова Расія, асабліва пры маладым імператару Пятру I, выяўляла вялікую актыўнасць у заваяванні і асваенні Балтыйскага ўзбярэжжа. Ад ваенных дзеянняў паміж Расіяй і Швецыяй асабліва пакутавала мясцовае насельніцтва — вепсы, іжорцы (інгерманландцы), карэлы, фіны, эсты.

Імкнучыся да хутчэйшага засялення гэтага краю, Пётр I пры раздачы тэрытарыяльнай здабычы членам царскага дома, сваім палкаводцам і дзяржаўным дзеячам абавязваў новых уладароў перасяляць у іх новыя памесці сялян з вялікарасейскіх губерняў і, вядома ж, з Рэчы Паспалітай. Прыгнаных прыгонных пасялялі, як правіла, не на голым месцы, а ў захопленых мызах, якія часта атрымлівалі новыя назвы.

Адносна назваў сяла *Кобрына* і рачулкі *Кобрынка,* што пад Гатчынай, можна сказаць: цалкам верагодна, што яны, назвы гэтыя, прыйшлі сюды разам з прыгнанымі з *брэсцкай Кобрыншчыны* нашымі землякамі.

...На мой зварот на імя цяперашняга главы адміністрацыі Гатчынскага раёна з просьбай патлумачыць паходжанне назваў “Кобрына” і “Кобрынка”, а таксама даты іх першага ўпамінання я атрымаў адказ наступнага зместу: *“Па рэчышчы ракі здабывалі торф і складвалі яго ў прыстасаванне, якое называлася копра; адсюль пайшла назва ракі Копрынка, ад ракі пайшла назва паселішча Копрына; затым яны перайначыліся на Кобрынку і Кобрына, што больш мілагучна. Упершыню дадзеныя назвы згаданы ў канцы XV стагоддзя. У XIV—XV стагоддзях гэтыя землі ўваходзілі ў склад Гаспадзіна Вялікага Ноўгарада”.*

Літаратурныя ж крыніцы сведчаць, што перайменаванне адбылося ў першай палове XVIII стагоддзя. Гэта якраз той час, калі прыгналі сюды нявольнікаў з Рэчы Паспалітай. Застаецца толькі дзівіцца, як “клапатліва” падабралі месца рассялення: да новай назвы прывыкаць амаль не трэба, яна зусім “твая”.

Адказ на тое, хто былі спаконвечныя жыхары тутэйшых мясцін, знаходзім у Пушкіна: *“Приют убогого чухонца...”* Чухонцы, як вядома, — дарэвалюцыйная народная назва эстонцаў, а таксама карэла-фінскага насельніцтва ў наваколлі Пецярбурга. Гэтыя мясціны Пётр I у свой час падараваў свайму паплечніку Пятру Мацвеевічу Апраксіну. Дарэчы, царская адміністрацыя ведала толк у працавітых і сумленных беларускіх людзях. Нездарма ж пазней паэт і губернатар Г.Дзяржавін пры ўзвядзенні свайго маёнтка “Званка” на Валагодчыне замяніў мясцовых работнікаў на будаўнікоў з нашага краю. У 1757 годзе ўладанні Апраксіна набыў арап Пятра Вялікага — Абрам Пятровіч Ганібал, прадзед Пушкіна па маці. Потым яно было падзелена паміж яго сынамі. Частка маёнтка Восіпа Абрамавіча Ганібала пры разводзе з жонкаю Марыяй Аляксееўнай Ганібал (гэта бацькі паэтавай маці) адышло да яе. Пасля некаторага драблення ўладанні бабулі Пушкіна былі прададзены зусім. За атрыманыя грошы адразу ж быў куплены падмаскоўны маёнтак Захарава, дзе акружаны клопатамі і пяшчотай бабулі і нянькі, правёў сваё шчаслівае дзяцінства будучы паэт...

Дык вось, паводле сведчанняў сястры Пушкіна Вольгі, Арына Радзівонаўна была родам з сяла Кобрына, якое знаходзілася вярстах у шасцідзесяці ад Пецярбурга. Некаторыя сведкі сцвярджаюць, што нянька Пушкіна нарадзілася ў недалёкай Суйдзе (Васкрасенскім), а ў Кобрына была аддадзена замуж. Прыгонны “стаж” Арыны Радзівонаўны выглядае так: 1 год — прыгонная Апраксіных, 22 гады — Ганібала, потым — ягонага сына, потым — бабулі паэта. Заўважым, што пры продажы Кобрына Марыя Аляксееўна пакінула Арыну Радзівонаўну з яе дачкой Надзеяй сабе. Надзея і яе муж Мікіта Казлоў па волі гаспадароў жылі разлучана: яна ў Захараве, ён у Пецярбургу, пры Пушкіне. Не бачыліся гадамі. У 1799 годзе, як сцвярджаюць многія літаратурныя крыніцы, Арына Радзівонаўна атрымала вольную, але палічыла за лепшае застацца ў Пушкіных.

Хто ж былі бацькі Арыны Радзівонаўны? Яны — Радзівон Якаўлеў (1728—1767) і Лукер’я Кірылава (1730—1796) былі прыгоннымі згаданага вышэй Ф.Апраксіна. Радзівон Якаўлеў (Якаўлеў — гэта не прозвішча — прыгонныя ў Расіі прозвішчы мелі вельмі рэдка; відаць, гэта імя па бацьку) па дакументах вядомы як сірата. Сіратой, як сцвярджаюць літаратурныя крыніцы, была і Лукер’я Кірылава. Бацькі асіраецелых нідзе не ўспамінаюцца. Паўстае законнае пытанне, ці не з’явіліся гэтыя сіроты-падлеткі тут разам з іншымі, дарослымі кобрынцамі-беларусамі? І ці не чужына, да ўсяго, і зблізіла іх, паслужыла перадумовай стварэння сям’і, у якой потым нарадзілася сямёра дзяцей? Сям’я гэтая рана страціла бацьку. Сярод усіх з сям’і асабліва цяжка даводзілася Арыне як старэйшай з дзяцей. А было ёй тады толькі 10 гадоў. І жыццё яе як пачалося бязрадасна, так без радасці і прайшло.

Звернемся цяпер да іншых фактаў, якія маглі б дадаткова сведчыць аб адносінах Арыны Радзівонаўны да такой шматпакутнай, як і яна сама, Беларусі. Цікавым бачыцца факт, што паўстанне прыгонных Ганібала (1766) вылілася ва ўцёкі “ў Польшчу”. Ці не дадому? А той факт, што адзін з сыноў Арыны Радзівонаўны быў уладальнікам вельмі не характэрнага для Расіі і пашыранага да Беларусі мужчынскага імя — Стэфан? Дадамо, што само імя Арына, як і імя Радзівон, належыць да старажытных беларускіх імён.

Даследчыкі жыцця і творчасці Пушкіна часта ўказваюць на мілагучнасць і спеўнасць мовы Арыны Радзівонаўны. Гэтыя якасці мовы жывуць і сёння на Беларусі. А пра беларускія элементы ў мове нянькі Пушкіна гаворыць фанетычнае афармленне, што дайшло да нас у двух невялікіх лістах, якія былі адпраўлены ёю на адрас паэта 30 студзеня і 6 сакавіка 1827 года.

І першы ліст, напісаны пад дыктоўку кімсьці з малапісьменных дваровых, і другі, таксама пад дыктоўку, але ўжо рукой Ганны Міхайлаўны Вульф, сведчаць аб аднолькавасці гучання некаторых слоў і выразаў у Арыны Радзівонаўны і ў сучаснай гутарковай мове заходнепаляшуцкага дыялекту. Напрыклад: “мачиха”, “нихто”, “Арина Радивоновна”, “цалую ваши ручки”. Чытаючы гэтыя лісты, адчуваеш, як у стыхіі рускай мовы бруіцца беларуская гаворка.

А сюжэты яе казак! Возьмем, напрыклад, казку пра папа і пра работніка яго Балду. Такую антыцаркоўную (маецца на ўвазе інстытут праваслаўнай папоўшчыны) накіраванасць, такую раскутасць чалавечага духу наўрад можна было сустрэць у рускіх казках таго часу.

...Разважаючы пра лёс Арыны Радзівонаўны, хочацца выказаць горкае шкадаванне, што мы, праяўляючы вялікую цікавасць да “донжуанаўскага спісу” Пушкіна, праходзім міма трагічнага лёсу чалавека, які так па-анёльску паўплываў на паэта.

Так, лёс гэтай найдабрэйшай, найадоранай жанчыны трагічны, як лёс самой Беларусі. Ці не адсюль гэты несціханы боль? Бо мне думаецца, што пры шчаслівым збегу акалічнасцяў наша зямля магла б мець сваю Сафо, сваю чарадзейку слова...

Яўген ГУЧОК,
сябра Беларускага саюза пісьменнікаў.

ЗДАРЭННЕ

Мост склаўся ў «гармонік»

Некалькі дзён таму Ганцавіцкім раёне Брэсцкай вобласці абрынуўся жалезабетонны мост праз раку Лань. Гэтае збудаванне, дзе размешчаны шлюз-рэгулятар, знаходзілася недалёка ад вёскі Чудзін.

Як паведаміў БелаПАН старшыня раённай камісіі па надзвычайных сітуацыях Вікенцій Монцік, інфармацыя аб тым, што мост пачаў асядаць, а затым паступова складвацца ў гармонік, паступіла ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях з пажарнага аварыйна-ратавальнага паста ў СПК “Лань”. На месца здарэння прыбылі ратавальнікі, была выстаўлена ахова, каб не дапусціць на пашкоджаны мост транспарт і людзей. Пацярпелых падчас надзвычайнага здарэння няма.

Паводле папярэдняй версіі, прычынай абвальвання стала вада, якая падмыла грунт пад адной з апор.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Вернікі змагаюцца за касцёл

Больш за 8 тысяч подпісаў сабраны ў падтрымку касцёла і манастыра бернардынцаў Мінска, якія, па рашэнні Мінгарвыканкама, аддаюцца пад будаўніцтва гатэля. Кампанія за захаванне помніка архітэктуры XVIII стагоддзя ідзе не толькі ў сталіцы, але захапіла Полацк, Брэст, Маладзечна, Оршу, іншыя гарады. Усе подпісы перададзеныя ў Адміністрацыю прэзідэнта. З 19 сакавіка 2005 года вернікі двойчы на дзень праводзяць малебны каля будынка былога касцёла — там цяпер месціцца архіў.

КРЫМІНАЛ

...а пацярпелая была згодна, каб яе прадалі

Супрацоўнікамі ўпраўлення наркакантролю і супрацьдзеяння гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама затрымана мясцовая жыхарка, якая падазраецца ў тым, што пастаўляла дзяўчат у Турцыю.

Як паведаміў БелаПАН спецыяльны карэспандэнт абласнога УУС Ігар Грышкевіч, затрыманне адбылося на гомельскім аўтавакзале. Жыхарка Гомеля 1977 года нараджэння спрабавала вывезці ў Турцыю гамяльчанку 1985 года нараджэння з мэтай сексуальнай эксплуатацыі. Жанчыны садзіліся ў аўтобус “Гомель—Кіеў—Мікалаеў”, але паехаць ім не ўдалося.

Паводле аператыўных звестак, гамяльчанкі планавалі дабрацца да сталіцы Украіны, а адтуль самалётам “Кіеў—Анкара” вылецець у Турцыю, дзе іх прымала сутэнёр — былая грамадзянка Украіны, якая ўзяла шлюб з туркам. За пастаўку адной адзінкі “жывога тавару” затрыманая атрымлівала 500—600 долараў. Прыкладна столькі ж даставалася і турэцкай сутэнёршы.

“Гандлярка ”жывым таварам" сама некаторы час займалася ў Турцыі прастытуцыяй, — паведаміў І.Грышкевіч. — *Два месяцы таму яна вярнулася на радзіму і занялася пастаўкай дзяўчат. Хачу зазначыць, што тым, хто жадаў папрацаваць у Турцыі, казалі адкрытым тэкстам, якім чынам і дзе давядзецца зарабляць грошы. Гандляры толькі не раскрывалі ўмовы працы: абяцалі вольны графік працы, выбар кліента, выхадныя дні. Насамрэч дзяўчатам, якія трапілі туды, адразу ж выстаўлялі рахунак у 2500 долараў, якія трэба было адпрацаваць, і ўводзілі розныя штрафныя санкцыі, так што многім даводзілася працаваць бясплатна дзень і ноч”.*

Затрыманай гамяльчанцы пагражае пакаранне згодна з артыкулам 181 Крымінальнага кодэкса — 10—12 гадоў пазбаўлення волі.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

НЯВЫДУМАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Сіняя папка

Сямейная лодка Каравайскіх разбілася аб рэўнасць: пляткаркі-дабрадзейкі данеслі Аліне, што Сяргей заляцаецца да маладой супрацоўніцы іх установы Караліны Яршэвіч. Гэта была чысцейшай вады лухта, бо ён не мог сабе такога дазволіць. Праўда, некалькі разоў падвёз Караліну з работы, бо жывуць на адной вуліцы. Вось і ўвесь грэх.

У той летні дзень Сяргей збіраўся ў Гродна, каб забраць важныя службовыя дакументы. Ужо два разы званілі, а ён за неадкладнымі справамі ўсё ніяк не мог выбрацца, хоць і ведаў, што атрымае за гэта прачуханку. Пра тое, што паедзе, Аліне казаць не хацеў, але потым успомніў, што яна збіраецца да доктара ў абласную паліклініку.

— Калі хочаш, паехалі ў Гродна, — сказаў ён раніцай. — Пакуль я ўладкую справы, ты сходзіш да доктара. Потым забяру.

— А пазней не мог сказаць?! — накінулася жонка. — Мне ж яшчэ збірацца трэба!

— То не лапачы, а збірайся, — ён грымнуў дзвярыма і пайшоў на ганак пакурыць.

Назад выехалі пасля палудня. Усе дакументы, якія ён атрымаў, у сіняй папцы ляжалі на заднім сядзенні. Побач стаяў пакет з прадуктамі, што накуплялі ў Гродне. А вось пра напой забыліся, і таму на выездзе з горада Сяргей забег у магазін. Калі выходзіў, у самых дзвярах сустрэў свайго інстытуцкага сябра. Яны шумна павіталіся.

— Спяшаюся, браток, жонка ў машыне чакае. Недаладу ў мяне з ёй. А так, каб быў са сваім шафёрам, па чарцы ўзялі б, пагаманілі б.

— Ды ліха з ёй, з чаркай. Ты, будзь ласкавы, падкінь да Ліды майго знаёмага. З турмы сёння выпусцілі. Наогул-то яму ў Магілёў трэба, але далей сам дабярэцца. Усё ж бліжэй, чым з Гродна.

Сяргей толькі цяпер звярнуў увагу на высокага хударлявага чалавека, што стаяў побач. Ён трымаў у руках вялікі цэлафанавы пакет.

— Падвязу, чаму ж не. Месца ёсць.

Яны развіталіся, і Сяргей з новым пасажырам пайшоў да машыны.

Аліна не вельмі ўзрадавалася незнаёмаму чалавеку. Акінуўшы крытычным позіркам яго бедную вопратку, узяла да сябе на калені пакет з прадуктамі. Сінюю папку Сяргей паклаў вышэй, да задняга шкла.

Толькі мінулі Скідзель, як машына раптам затурзалася і стала. Сяргей выйшаў, падняў капот. Праз некаторы час ён гукнуў у салон:

— Можаце пакуль што пагуляць, а я займуся рамонтам.

Той рамонт зацягнуўся на гадзіны паўтары. І жонка, і той чалавек сядзелі ў салоне моўчкі, потым выходзілі прагуляцца па шашы. Кожны паасобку.

Да свайго горада дабраліся, калі скончыўся рабочы дзень. Сяргей падвёз пасажыра на чыгуначны вакзал, а сам з жонкай паехаў дадому. Машыну ў службовы гараж не пагнаў, паставіў на сваім двары пад акном, дзе не раз начавала і машына яго сына, калі той прыязджаў у госці з нявесткай і малым унукам.

Назаўтра раненька ён паехаў на работу, бо не быў жа ўчора цэлы дзень і не цярпелася даведацца, якія там парадкі. І толькі правёўшы планёрку, успомніў пра сінюю папку з дакументамі. Пайшоў да машыны, адамкнуў дзверцы. Папкі там, дзе ён яе паклаў, не было. У Сяргея па спіне пабеглі мурашкі. Ён абгледзеў і абмацаў увесь салон — не было, і ўсё тут.

Адразу ж пазваніў жонцы:

— Аліна, у мяне з салона прапала папка з дакументамі... — прамовіў асіплым голасам.

— Я не вартаўнік тваіх папак. Дзе паклаў, там і вазьмі. Зусім галаву страціў ад новага кахання, — сказала жонка. — Возіш там усякіх, а ў мяне пытаеш пра папку.

“Напэўна, яна кажа праўду. Той чалавек скраў і сунуў у свой вялікі цэлафанавы пакет. Але навошта яна яму? Паглядзіць ды выкіне, а мяне з пасады скінуць. Гэта сама меней”, — думаў, ходзячы па кабінеце, бо спакойна сядзець не мог.

— Што-небудзь здарылася? — увайшоўшы, спытаў намеснік. — У цябе твар шэры.

— Здарылася, брат, яшчэ як здарылася, — з трывогай у голасе сказаў Сяргей і расказаў усё па парадку.

— А дзе шукаць таго чалавека? Прозвішча, імя ты яго ведаеш?

— Нічога не ведаю. У міліцыю Магілёўскай вобласці трэба званіць, ён жа, як вярнуўся з турмы, павінен адзначыцца ў міліцыі.

— Яно так, Сяргей. Але калі той чалавек не вінаваты, разумееш, які гэта будзе для яго ўдар? Зноў пасадзяць, будуць дапытваць... А дома глядзеў? Можа, ты дастаў папку з машыны і паклаў дзе-небудзь дома?

— Не даставаў я... — няўпэўнена прамовіў Каравайскі. Ён ужо сам сабе не верыў і гатовы быў шукаць сінюю папку нават там, дзе яе быць не магло наогул.

Паехаў дадому. Хадзіў з пакоя ў пакой, потым сеў на кухні за стол і абхапіў галаву рукамі: дзе шукаць, што рабіць?

Аліна капалася ў кладоўцы і на яго перажыванні ды роспач не звяртала ўвагі.

“Чым мне горш, тым ёй лепш, — з жалем падумаў Сяргей. — І гэта называецца жонка”.

Ён выйшаў з дому з цвёрдым намерам пазваніць у Магілёў, у міліцыю і спытаць пра ўчарашняга выпадковага пасажыра. Адчыніў дзверцы, кінуў погляд на тое месца, дзе ляжала папка, і вачам сваім не паверыў: яна была там! “Аліна... Гэта яна мяне ледзь да інфаркту не давяла. Выкрала, а цяпер падкінула...”

— Твая работа? — зайшоўшы з папкай у кладоўку, спытаў з горыччу.

— Я нічога не ведаю, — быў адказ.

— Усё ты ведаеш, дык ведай жа яшчэ больш: жыць з табой я не буду. Збяру дакументы і неадкладна падам на развод. Мне жонка-вораг не патрэбна.

...Праз пэўны час іх развялі. Сяргей звольніўся з работы і паехаў у Расію да брата, які мае там даволі буйную прыватную фірму.

Аліна засталася адна ў вялікім пустым доме. Зрэдку да яе прыязджае сын з сям’ёй, а так жыве адна. Яна ўжо дзесяць разоў пакаялася, што з-за пустых кабечых плётак разбурыла сваё шчасце. Ды што прайшло, таго ўжо не вернеш...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

г.Ліда.

(Па пэўных прычынах імёны і прозвішчы людзей зменены.)

ДЗІКУНСТВА

Як у Пружанах ледзь не «паплыла» бібліятэка

Прадстаўнікі актыўнай грамадскасці г.Пружаны вырашылі правесці сход-вечарыну ў гонар 89-й гадавіны БНР. У адпаведнасці з заканадаўствам была пададзена ў райвыканкам заява і атрыманы дазвол. Меркавалася, што мерапрыемства пройдзе ў літаратурнай гасцёўні цэнтральнай раённай бібліятэкі. Склалі праграму, запрасілі гасцей, у тым ліку і школьнікаў, раздалі запрашэнні жыхарам горада з інфармацыяй аб гістарычнай сутнасці свята Волі.

Здавалася, усё складваецца належным чынам, але ў апошнія перадсвяточныя дні з’явілася пачуццё няўпэўненасці, сталі заўважаць, што адбываецца нешта непрадбачанае. Раптам пачалі адмаўляцца ад удзелу ў святочным сходзе нават тыя людзі, якія шчыра адданыя беларускасці і напярэдадні з энтузіязмам сустрэлі ідэю святкавання Дня Волі.

Тым не менш праграма заставалася амаль без змен, і мерапрыемства павінна было адбыцца па загадзя складзеным плане. Але раптам, пасля 15 гадзін 25 сакавіка, мне як арганізатару сходу патэлефанавала Наталля Канстанцінаўна Супруновіч, дырэктар бібліятэкі. У яе голасе адчувалася нейкая няёмкасць, яна абвясціла, што ў гасцёўні праваліся трубы і памяшканне заліло вадой, а таму мерапрыемства не можа адбыцца.

Людзей, якія ў прызначаны час прыйшлі да будынка бібліятэкі, не ўпусцілі ўнутр. Дзверы дырэктар зачыніла на вачах усіх прысутных і пакінула бібліятэку. Нікога з супрацоўнікаў ужо не было, хаця рабочы дзень яшчэ нават не блізіўся да завяршэння. З-за вугла будынка і насупраць на аўтамабільнай стаянцы сачылі за намі трое: адзін у міліцэйскай форме, двое у цывільным.

Сход мы правялі з абмежаванай колькасцю людзей на прыватнай кватэры.

На наступны дзень высветлілася, што аварыя — гэта самая звычайная хлусня. Ніхто з супрацоўнікаў бібліятэкі не пацвердзіў факт аварыі, не было яе слядоў і ў будынку бібліятэкі, не пацвердзіла гэта і аварыйная служба ЖКГ. Дырэктар бібліятэкі знайшла прычыны, каб на працягу трох дзён пазбягаць сустрэчы з намі. Нават не выйшла на працу, калі мы патэлефанавалі ёй. Высветлілася: раптоўна забалела галава, падняўся ціск. Так гэта ці не, мы не сталі высвятляць, толькі пажадалі ёй хутчэйшага выздараўлення.

Пасля ўсяго таго, што здарылася, звярнуліся з заявай па факту зрыву мерапрыемства да старшыні райвыканкама. Хоць здагадваемся, які будзе адказ...

Тарэса ЖЭГАЛАВА,
жыхарка г.Пружаны.

Небяспечнае піва

Доля насельніцтва Беларусі, якое ўжывае піва, павялічылася з 40,5% у 2004 годзе да 48% у 2006 годзе. Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла Жылевіч.

Паводле яе слоў, гэтыя 48% у асноўным складаюць маладыя людзі. На думку спецыяліста, “піва — гэта алкагольны напой”, таму Міністэрства аховы здароўя падтрымлівае любыя забаронныя меры ў адносінах да рэкламы і ўжывання піва ў грамадскіх месцах. *“Рэклама стварыла ў маладых людзей памылковае перакананне ў тым, што піц піва — гэта прыгожа і амаль бясшкодна”,* — зазначыла Л.Жылевіч.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

В Минске после 20-летнего перерыва вновь начнут высаживать тополь…

...причем китайский. Об этом сообщил заместитель директора КУП “Минскзеленстрой” Александр Токарев.

Тополь снискал нелюбовь горожан из-за обильного пуха в начале лета. В прошлом году на “горячую линию” Мингорисполкома стали поступать звонки с жалобами на это “неудобство” с предложениями провести даже вырубки этих деревьев.

Специалисты нашли решение проблемы, предложив альтернативный вариант — китайский тополь. Как пояснил собеседник, он выгодно отличается от своего “собрата”. Такой тополь имеет красивую декоративную крону, устойчив к загрязнению почвы, способен очищать воздух от вредных выбросов. Но самое главное — эти деревья почти не дают пуха.

Заместитель директора предприятия рассказал, что всего в нынешнем году в Минске будет посажено 27 тысяч деревьев. Только весной планируется высадить 15 тысяч саженцев. Столицу украсят липа, клен, береза, ясень, дуб, рябина.

БЕЛТА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 КРАСАВІКА 2007 г.

АФІЦЫЙНА

Як звычайна, аб'яўляецца суботнік

Урад Беларусі рэкамендаваў органам дзяржкіравання, арганізацыям, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам на добраахвотнай аснове правесці 21 красавіка рэспубліканскі суботнік на працоўных месцах.

Прапаноўваецца таксама ажыццявіць добраўпарадкаванне і прывядзенне ў належны стан сквераў, паркаў, іншых зон масавага адпачынку, праезнай часткі вуліц, тратуараў і дваровых тэрыторый.

Зробленыя на працоўных месцах у дзень правядзення рэспубліканскага суботніка грашовыя сродкі прапанавана пералічыць у аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам, якія ў сваю чаргу накіруюць 50% гэтых сродкаў у Міністэрства фінансаў. У пастанове падкрэсліваецца, што пералічэнне сродкаў — справа добраахвотная.

Згодна з дакументам, 50% грашовых сродкаў, зробленых на рэспубліканскім суботніку, будуць накіраваны на дадатковае фінансаванне капітальнага рамонту "Нацыянальнага дзіцячага аздараўленчага лагера "Зубраня", набыццё транспартных сродкаў для дастаўкі дзяцей у гэтую ўстанову, выданне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для дзяцей і т.п.

Яшчэ 50% грашовых сродкаў застануцца ў распараджэнні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама і будуць выкарыстаны на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, будаўніцтва жылых дамоў для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, набыццё спецыяльнага абсталявання і транспартных сродкаў для арганізацый падвозу дзяцей-інвалідаў і вырашэнне іншых пытанняў па сацыяльнай падтрымцы дзяцей і сем'яў, якія выхоўваюць іх.

Міністэрству транспарту і камунікацый, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму даручана забяспечыць у гэты дзень бесперабойную работу пасажырскага транспарту.

Марына НОСАВА.

ЧУЛІ?

Гомельскі аэрапорт аднаўляе пасажырскія рэйсы ў Маскву

Прадстаўнікі РАУП "Аэрапорт "Гомельавія", маскоўскага аэрапорта "Дамадзедава" і расійскай авіякампаніі "Пералёт" падпісалі дагавор аб адкрыцці рэгулярнага рэйса Масква—Гомель—Масква.

Плануецца, што рэгулярныя авіяперавозкі будуць ажыццяўляцца двойчы на тыдзень. Перавозіць пасажыраў будуць самалёты "SAAB 2000". Кошт пералёту складзе каля 100 долараў ЗША.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

КРЫМІНАЛ

Буйны ўлоў

Супрацоўнікі мінскай міліцыі канфіскавалі самую буйную за апошнія сем гадоў партыю амфетаміну.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, супрацоўнікі міліцыі затрымалі на гэтым тыдні ў сталіцы раней судзімага мясцовага жыхара — збытчыка наркотыкаў, у якога канфіскавалі 50 грамаў амфетаміну. Прасачыўшы злачынны ланцужок, супрацоўнікі ГУУС выйшлі на жыхара Гродна, якога праз некаторы час затрымалі ў абласным цэнтры. Пры вобыску ў яго было канфіскавана больш за 800 грамаў амфетаміну коштам больш за 16 тысяч долараў.

Распачаты дзве крымінальныя справы на падставе артыкула 328 Крымінальнага кодэкса Беларусі (незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і прэкурсораў).

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

РЕДКІЕ ЛЮДЗІ

Академик из Милеек

Владимир Михайлович собирался в Белорусский государственный университет. Там у него встреча, лекция для преподавателей. И, наблюдая за тем, как быстро пишет он тезисы доклада, я заметил: Римша волнуется. Для меня это было удивительным. Академик принимал участие в международных конгрессах, выступал на них и не пасовал перед светилами мировой науки. А здесь беспокоится. Почему?

Словно услышав мой невысказанный вопрос, Владимир Михайлович оторвался от стола, посмотрел на меня и произнес задумчиво:

— Дома всегда трудно выступать. И учти, я это делаю в первый раз.

Да, в Беларуси у Римши не сложились отношения. Кое-кто смотрел на него свысока: бывший колхозник, а в князья метит. Да и характер у Владимира Михайловича не золотой: резок, за словом в карман не лезет, не любит искать обходных дорог. А это не всем нравится: мол, поклонись, потом и говорить будем.

